Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich
Пролетарии всех стран

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧ... РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНА... І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ Б... С. С. Р.

СУБОТА
16 мая 1931 году
№ 109 (3197)

Алма-Ата, Ленина 81 Гос. Публич. библ-ка Респ. Яна.-32р. | СВ.-1

У БОЙ ЗА ВЫРАШЭНЬНЕ КАРМОВАЙ ПРАБЛЕМЫ

ПРАБЛЕМА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З АСНОЎНЫХ ПРАБЛЕМ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) адзначыў, што вырашэньне гэтай праблемы павінна быць пастаўлена «пад асобны кантроль рабочае клясы і яго партыі». Вырашаем мы гэту праблему тымі-ж шляхамі, якімі вырашылі праблему зярнёвую,—шляхамі будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў.

Гэта будаўніцтва праходзіць выключна інтэнсіўна па ўсім Савецкім саюзе, у тэмпах, якія перавышаюць нават тэмпы будаўніцтва зярнёсаўгасаў, у абставінах лютага супраціўленьня кулацтва. У БССР—рэспубліцы, якая ў значнай сваёй частцы зьяўляецца жывёлагадоўчай, вялізарныя эмпы гэтага будаўніцтва бачны з выключнай відавочнасьцю.

Але, адзначаючы нашы сур'ёзныя посьпехі ў галіне вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, мы, разам з тым, павінны з усёй сілай падкрэсьліць той факт, што КАРМОВАЯ БАЗА ЗНАЧНА АДСТАЕ АД БУРНЫХ ТЭМПАЎ БУДАЎНІЦТВА ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ. КАРМОВАЯ БАЗА — САМЫ СЛАБЫ ЧУЧАСТАК ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАГА ФРОНТУ.

А між тым, кожнаму павінна быць ясна, што МАСЛА, МАЛАКО, МЯСА—ГЭТА НІШТО ІНШАЕ, ЯК ПЕРАПРАЦАВАНЫ СІЛОС, СЕНА, КАНЦЭНТРАВАНЫЯ КАРМЫ. Кожнаму павінна быць ясна вялізарнае палітычнае народна-гаспадарчае значэньне кармовага пытаньня. Зусім відавочна, што НЕДААЦЭНКА ЗНАЧЭНЬНЯ КАРМОВАГА ПЫТАНЬНЯ ЁСЬЦЬ НІШТО ІНШАЕ, ЯК МАХРОВЫ ПРАВЫ АПАРТУНІЗМ.

Вопыт мінулай зімы, напружанае становішча з фуражом, якое стварылася зараз, павінны паслужыць сур'ёзным урокам для ўсяго сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, павінны адыграць ролю заклёка на рашучую бальшавіцкую барацьбу за кармовую базу.

ЧАТЫРЫ ЗАДАЧЫ СТАЯЦЬ ПЕРАД НАМІ.

Мы маем сёлета цьвёрдае заданьне значна пашырыць пашывы травасеў, давесьці засеў кармовых кораньплодаў да 80 тыс. га і засеяць сілосными культурамі плошчу ў 35 тыс. га. Побач з гэтым, урад БССР у праграме другой бальшавіцкай вясны даў цьвёрдую дырэктыву аб правядзеньні буйнейшых работ па каранным і павярхоўным палепшаньні сенажаці. Гэту праграму, якая забясьпечвае вырашэньне ў асноўным кармовага пытаньня ў БССР, трэба па-баявому, бяз усякіх скідак, на ўсе 100 проц. выканаць. Ні малейшага адступленьня ад гэтай праграмы мы ня можам дапусьціць. ГЭТА—НАША ПЕРШАЯ І ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА. КОЖНЫ ПРОЦАНТ НЕДАВЫКАНАНЬНЯ ПАСЕЎНАГА ПЛЯНУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СУР'ЁЗНАЙ ПАГРОЗАЙ ДЛЯ НАШАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СУР'ЁЗНАЙ ПЕРАШКОДАЙ НА ШЛЯХУ ВЫРАШЭНЬНЯ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ПРАБЛЕМЫ.

ДРУГАЯ ЗАДАЧА—гэта ПРАВІЛЬНАЯ І СВАЯЧАСОВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СЕНАКАШЭНЬНЯ. Мы павінны дабіцца таго, каб да сенакосу было прыступлена своячасова, каб былі выкінуты ў архіў дзядоўскі звычай пачынаць сенакос пасьля «Пятрова дня». Правільнай растаноўкі сіл на сенажаці, поўнай нагрузкай сенаўборачных машын ТРЭБА ДАБІЦЦА, КАБ НЕ ПРАПАЎ НІВОДЗІН ЦЭНТНЭР СЕНА, КАБ УСЁ СЕНА, ДА АПОШНЯГА КІЛЁГРАМА, БЫЛО ЎБРАНА. І яшчэ адно важнейшае мерапрыемства неабходна правесьці: у цэлым радзе раёнаў БССР мы, як зусім рэальны і практычны можам, выкінуць лёзунг: «ДАЁШ ДВА СЕНАКОСЫ Ў ГОД».

ТРЭЦЯЯ ЗАДАЧА ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў АРГАНІЗАВАНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СІЛОСНАЙ КАМПАНІІ. Першы вопыт сіласаваньня, праведзены ў масавым маштабе, даў выключна спрыяючыя вынікі. У вялізарнай колькасьці саўгасаў і калгасаў сілос у мінулую зіму адыгрываў рашаючую ролю. Аднак, ПАПУЛЯРЫЗУЕЦЦА ПОСЬПЕХ ПЕРШАГА ВОПЫТУ СІЛАСАВАНЬНЯ СЛАБА. МАСАВАЙ РАБОТЫ ВАКОЛ СІЛОСА І ПАДРЫХТОЎКІ СПЭЦЫЯЛЬНЫХ КАДРАЎ МЫ НЯ БАЧЫМ. А між тым, заданьне ЗАСІЛАСАВАЦЬ У БССР МІЛЬЁН ТОН ЗЯЛЁНАЙ МАСЫ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БАЯВОЙ ПРАГРАМАЙ, зьнізіць якой мы ня маем права ні на адзін процант.

У гэтай-жа сувязі неабходна сказаць і аб задачах нашай прамысловасьці. ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЗАКЛІКАНА АДЫГРАЦЬ ВАЖНЕЙШУЮ РОЛЮ Ў РЭКАНСТРУКЦЫІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ. СІЛАСАРЭЗКІ І СІЛОСНЫЯ ВЕЖЫ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА АСНОЎНЫМІ ЭЛЕМЭНТАМІ ГЭТАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ. Аднак, і па сіласарэзках і па сіласных вежах мы маем значнае недавыкананьне вытворчых праграм. Дрэваапрацоўчая і мэталяапрацоўчая прамысловасьць БССР у буйнейшым даўгу перад сацыялістычным сэктарам сельскае гаспадаркі. Гэты доўг павінен быць пакрыты беззадкладна. Партыйныя арганізацыі, рабочыя калектывы і адміністрацыйна-тэхнічны персанал гэтых галін прамысловасьці павінны зразумець, што ад іх у значнай меры залежыць поўнае выкананьне пляну падвядзеньня магутнай кармовай базы пад жывёлагадоўлю, якая бурна разгортваецца.

ЧАЦЬВЕРТАЙ ЗАДАЧАЙ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПРАВІЛЬНАЕ СКАРЫСТАНЬНЕ КАРМОЎ НА ПРАЦЯГУ ЎСЯГО ГОДУ, БЯРЭЖЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЎСІХ ГУМЕННЫХ КАРМОЎ. Трэба рашуча змагацца супроць разбазарваньня кармовых фондаў. Правілам павінна зрабіцца наступнае ўказаньне Наркамзему СССР тав. Якаўлева: «Рашаючым... зьяўляецца распаўсюджваньне на кармовыя рэсурсы правіл разьмеркаваньня, устаноўленых у адносінах да ўсіх асноўных прадуктаў: у першую чаргу цалкам і поўнасьцю за кошт калгасных рэсурсаў забясьпечваецца абагуленая жывёла (рабочая жывёла, калгасныя фэрмы), усё-ж астатняе разьмяркоўваецца ў лік даходу калгаснікаў у адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных працадзён, зразумелая рэч, з улікам колькасьці жывёлы».

Вырашэньне гэтых чатырох задач гарантуе ліквідацыю напружанага становішча з фуражом, падводзіць пад жывёлагадоўлю досыць трывалую кармовую базу. Таму гэтыя чатыры задачы павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсіх партыйных, савецкіх і калгаснакааперацыйных арганізацый. Таму барацьба за гэтыя чатыры задачы павінна зрабіцца вядучай у справе стварэньня кармовай базы, у справе забясьпечаньня пасьпяховага вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы.

У ТАКТ ЗАКУЛІСНАЙ ПАЛАЧЦЫ ФРАНЦУСКАГА ГЕНШТАБУ

фінляндзкія фашысты рыхтуюць узброены напад на СССР

Па ўсёй краіне ідзе шалёная ваенная падрыхтоўка

ГЕЛЬСЫНГФОРС, 2. Адначасна з антысавецкай кампаніяй у Фінляндыі праводзіцца шалёная ваенная падрыхтоўка. Паводле паведамленьняў газэт, так званая,—фінляндзкая арганізацыя «супроцьгазавай абароны», якая налічвае 14.000 чал., прыступіла да правядзеньня масавай ваеннай прапаганды сярод насельніцтва.

Па патрабаваньні гэтай арганізацыі 18 гельсынгфорскіх акцыянэрных таварыстваў абавязаліся пабудаваць на сваіх вучастках нават убежышчы. У сучасны момант у Гельсынгфорсе ўжо пачата пабудова аднаго вялікага газавага ўбежышча. Новыя ўстановы набылі буйныя партыі супроцьгазаў для сваіх служачых. Шюцкор (фашысцкая ваенная арганізацыя) таксама павялічыла ў сувязі з антысавецкай кампаніяй сваю дзейнасьць. У распараджэньне Шюцкор перадаецца берагавая артылерыя,—адзін з най больш адказных вучасткаў у выпадку вайны. Апрача таго, Шюцкер атрымаў ад Гельсынгфорскага муніцыпалітэта новыя дадатковыя асыгнаваньні ў разьмеры 250.000 марак на пабудову супроць-самалётных батарэй. Іх працягваюць прыбываць у Фінляндыю новыя партыі ваенных самалётаў. На днях чакаецца спуск новай падводнай лодкі для фінляндзкага ваеннага флёту. Прысьпешана вядуцца работы па пабудове новага крэйсера. Намячаецца павялічэньне кананэрнага флёту.

***

У такт закулісной дырыжорскай палачцы французкага генштабу фінляндзкія фашысты, як фарпостны атрад у інтэрвэнцыі супроць СССР, пачалі шалёную антысавецкую паклёпніцкую кампанію, задачай якой зьяўляецца—падрыхтаваць грамадзкую думку да ўзброенага нападу на краіну Саветаў.

Фашысцкая Фінляндыя ў плянах ваеннай авантуры антысавецкага крыжовага паходу займае, як і другія прымежныя з намі краіны ваеннай фашысцкай дыктатуры (Польшча, Румынія) ролю непасрэднага выканаўня ўзброенага нападу на Савецкі саюз. Бязумоўна, удзельная вага ў інтэрвэнцыянісцкіх плянах Фінляндыі ў параўнаньні з Польшчай і Румыніяй далёка меншая, і таму ваенна-авантурны шлях фашысцкай Польшчы для Фінляндыі зьяўляецца прыкладам. — «Польшча,—заяўляе адна з самых уплывовых фінскіх газэт,—зьяўляецца аднэй з самых вонкавых гарантый захаваньня самастойнасьці Фінляндыі».

Вонкавая палітыка Фінляндыі была накіравана на ўсямернае зблiжэньне з фашысцкай Польшчай. на зблiжэньне ў іх «мірных» імкненьнях, на падзел роляй у антысавецкай інтэрвэнцыі.

Апошнія месяцы ў вонкавай і ўнутранай палітыцы Польшчы, Румыніі, Фінляндыі адзначаюцца «веснавым ажыўленьнем» — інтэрвэнцыянісцкіх плянаў. У галіне грамадзка-палітычнай паўсядзённа вядзецца шалёная антысавецкая кампанія, поруч з гэтым ідуць пробныя мабілізацыі, перабудова прамысловасьці ў дапасаваньні да ваенных патрэб і тэрор, як мэтад забясьпячэньня спакойнага тылу.

Антысавецкая кампанія ў фінляндзкіх фашыстаў пачалася пад лёзунгам «абароны інгерманляндзкага народу ад жахаў калектывізацыі». «Жахі» калектывізацыі ў Савецкай Карэліі і Ленінградзкай вобласьці заключаюцца ў тым, што бядняцка-сераднякіня масы сялянства будуюць новае жыцьцё без капіталістаў і крывасмоктаў-кулакоў.

Фактычны бок гэтай кампаніі, фактычны яе сэнс і мэтанакіраванасьць становіцца, яшчэ ясьнейшым з сёнешняга паведамленьня аб тым, што поруч з паклёпніцкай кампаніяй аб «жахах калектывізацыі» па ўсёй краіне ідзе шалёная ваенная падрыхтоўка. Фашысцкія сацыял-фашысцкія і нацыянал-фашысцкія ваенныя арганізацыі пастаўлены на ногі. Сярод насельніцтва вядзецца ваенная прапаганда. Акцыянэрныя таварыствы будуюць на свой кошт убежышчы. Ня ўзброеныя фашысцкія атрады ўзбройваюцца па апошняму слову тэхнікі і праходзяць спэцыяльную вайсковую вучобу. Фашысцкая Фінляндыя рыхтуецца атрымаць загад нападаць на Савецкі саюз.

Факт прысьпешанай ваеннай падрыхтоўкі з яскрава выражаным антысавецкім напрамкам у Фінляндыі ў комплексе з такімі-ж працэсамі, якія адбываюцца ў Польшчы і Румыніі, сьведчыць аб непасрэдным нарастаньні ваеннай небясьпекі.

Мы не дадзім сябе справакаваць. Мы зорка будзем сачыць за ўсім па той бок нашай мяжы, каб у патрэбны час быць гатовымі даць адпор.

Верным слугам на Заходняй Беларусі

НЕАБХОДНЫЯ ПРЫЛАДЫ ДЛЯ ВЫКОНВАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ.

Лодзінскія капіталісты заклікаюць да ўвядзеньня прымусовай працы

ВАРШАВА. Орган фабрыкантаў-пільсудчыкаў у радзе артыкулаў выступае з рэзкім заклікам увесьці ў Польшчы сыстэму прымусовай працы для беспрацоўных і абвясьціць іхзьяцьце дапамогі на беспрацоўю.

Лодзінскіх «Праўда» з катэгарычным заклікам увесьці ў Польшчы для беспрацоўных і абвясьціць іхзьяцьце дапамогі на беспрацоўю.

Газэта піша: «Становішча рабочае клясы, бязумоўна будзе вельмі цяжкім на працягу доўгага часу, і мы ўсё роўна ня можам разьлічваць на захаваньне сымпатый рабочае клясы да ўраду. Нават пры наяўнасьці сацстрахаха 300.000 армія беспрацоўных, сканцэнтраваная ў некалькіх буйных цэнтрах, усё роўна зьяўляецца небясьпекай для грамадзкага парадку».

Выходзячы з гэтых меркаваньняў, газэта патрабуе адмены такіх «папятыўных мерапрыемстваў», як сацстрах, больничныя касы, нармiраваны рабочы дзень і г. д.

Перад чарговай канфэрэнцыяй па разбраеньні

БЭРЛІН, 13 мая. Паводле зьвестак «Бэрлінэр тагеблат», нямецкі ўрад мае намер прапанаваць у Жэневе заключэньне мытнага саюзу паміж Нямеччынай і Францыяй. Калі ў Жэневе ня ўдасца дабіцца згоды, пытаньне аб аўстра-нямецкім мытным саюзе давядзецца, паводле слоў газэты, стаўіць на вырашэньне міжнароднага трыбунала ў Гааге.

Апрача пытаньня аб мытным саюзе, вялікае значэньне будуць мець на сэсіі пытаньні, зьвязаныя з падрыхтоўкай канфэрэнцыі па разброеньні. Па думцы палітычных колаў, амаль не падлягае ніякаму сумненьню, што старшынёй канфэрэнцыі па разброеньні будзе абраны ангельскі міністр замежных спраў Гендэльсон, а месцам засяданьня канфэрэнцыі будзе вызначана Жэнэва. Падрыхтоўку да канфэрэнцыі будзе весьці савет Лігі нацыі і яго дакладчык па пытаньні аб разброеньні, новы міністар замежных спраў Гішпаніі Лерус,—у цесным кантакце з будучым старшынёй канфэрэнцыі.

Нямецкі друк вельмі стрымана рэагуе на паведамленьні аб тым, што перад пачаткам сэсіі ў Жэневе будзе заключана рэгіянальная мытная згода паміж Італіяй, Аўстрыяй і Вэнгрыяй. Адзін толькі «Форвэртс» піша, што, магчыма, ствараюцца два супроцьлежныя блёкі: з аднаго боку—Францыя, Чэха-Славакія, Югаславія, Румынія і Польшча, а з другога—Нямеччына, Італія, Аўстрыя і Вэнгрыя. Для прыцяпновых прыхільнікаў нямецка-французкага супрацоўніцтва адкрываюцца, паводле слоў газэты, вельмі няўцешныя пэрспэктывы і сацыял-дэмакратыя там і павінна заняць самую рэзкую пазыцыю супроць саюзу Нямеччыны і Аўстрыі з Італіяй і Вэнгрыяй.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

ЛЁНДАН. Вядомы пісьменьнік Бэрнард Шоў, выступаючы на банкеце ў таварыстве журналістаў у Лёндане, рэзка крытыкаваў пазыцыю, якую займае ангельскі друк у адносінах да СССР.

«Друк, заявіў Шоў, да гэтага часу яшчэ не зразумеў, што ў сьвеце адбылася вялікая рэвалюцыя. Мы да гэтага часу яшчэ не зразумелі таго, што савецкая ўлада усталявалася, і ў выніку мы ня толькі трацім адну з вялічэзных магчымасьцяй для гандлю, на якую ніхто з нас ня мог ніколі спадзявацца, але таксама вялікую магчымасьць аказаць дапамогу будаўніцтву савецкай рэспублікі».

Шоў у заключэньне заявіў: «вывад такі—адталасьць у часе павінна быць зьнішчана. Трэба тварам да твару глядзець у будучыню і мары аб мінулым павінны расьсеяцца».

***

ДАНЦЫГ. Мясцовыя газэты публікуюць паведамленьні аб новым атрыманым ад СССР заказе на 9 буксіраў і аб першай пробнай партыі пляменнай жывёлы, купленай у Данцыгу для СССР.

Друк падкрэсьлівае усю вагу заказаў і савецкіх закупак для эканамічнага жыцьця Данцыга і для разьвіцьця эканамічных умоў паміж Данцыгам і СССР.

Пераходныя сьцягі--лепшым саўгасам і калгасам

Калгас „Прасьвет" скончыў пасеў ярыны і становіцца ў рады кандыдатаў на атрыманьне пераходнага сьцягу

Рашуча ўдарыць па зрыўшчыках пасеўнай, на грамадзкі буксір адстаючых, усе сілы на выкананьне другой бальшавіцкай!

Скончылі пасеў ярыны

Калгас «Прасьвет» Азарыцкага раёну, у выніку ўдарнай работы на палёх, ужо скончыў пасеў ярыны. Зараз калгасу засталося засеяць толькі бульбу.

Калгасьнікі ўвесь час працавалі па ўдарнаму, брыгадамі, на аснове зьдзельшчыны.

У выніку бальшавіцкай работы калгасу і добрай падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы, у калгас улілося 15 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Калгас поўнасьцю выканаў плян кантрактацыі.

Калгас «Ленінскі Шлях», гэтага-ж раёну, ужо засеяў 12 га яравых культур. Да 20 мая калгас мяркуе скончыць сяўбу ярыны. Гэты калгас таксама ўсю работу праводзіць на асновах зьдзельшчыны і па ўдарнаму, у выніку чаго ў калгас уступіла 4 бядняцка-сераднякіх гаспадаркі.

Ударная брыгада «Савецкай Беларусі»:
А. Кузьмянок, М. Міцкевіч, К. Цішкевіч.

Саўгас Навасёлкі ўступіў у бой за пераходныя сьцягі

КОЙДАНАВА, 15-V. Рабочыя саўгасу Навасёлкі вітаюць пастанову ЦК КП(б)Б аб правядзеньні агляду разгортваньня сацспаборніцтва ў саўгасах, калгасах і МТС у часе другой бальшавіцкай сяўбы.

Саўгас Навасёлкі па баявому ўключэцца ў правядзімы конкурс на лепшае выкананьне плянаў пасеўнай кампаніі. Рабочыя саўгасу Навасёлкі выклікаюць на сацспаборніцтва і ўдзел у конкурсе за пераходныя сьцягі саўгас Шыкатавічы, куды выяжджае рабочая брыгада для заключэньня сацдагавару.

Агульны сход рабочых саўгасу Навасёлкі даручае рабочкому саўгасу арганізаваць самаправерку выкананьня сацдагавароў паміж брыгадамі і асобнымі ўдарнікамі ўнутры саўгасу. Лепшых ударнікаў заносіць на чырвоную дошку і прэміраваць, адначасова павёўшы рашучую барацьбу з лжэўдарнікамі і прагульшчыкамі і бяручы адстаючых на грамадзкі буксір.

Для дапамогі ў правядзеньні праверкі і кантролю па выкананьні ўмоў конкурсу ў саўгасе выстаўляецца ўдарны пост газэты «Ударнік Койданаўшчыны».

Пост-брыгадзір газ. «Ударнік Койданаўшчыны» і «Сав. Бел.»: Дубіцкі.

Ударная работа на калгасных палёх—моцны ўдар па кулацтву

Калгас «Араты», Пясочанскага сельсавету, Копыльскага раёну, сяўбу рас пачаў упаўне падрыхтаваным.

Усе калгасьнікі разьбіты на рабочыя брыгады, якімі кіруюць брыгадзіры, абраныя з лепшых ударнікаў. Некаторы недахват у пастромках калгасьнікі рашылі ліквідаваць сваімі сродкамі, зьвяўшы пастромкі са сваёй пянькі.

У калгасе поўнасьцю ліквідавана абязьлічка і ўведзена зьдзельшчына.

Ударная работа калгасьнікаў на палёх выклікала новы прыліў у калгас беднаты і сераднякоў - аднаасобнікаў. У калгас пачалі паступаць заявы аб прыёме, а беднякі і сераднякі-аднаасобнікі з в. Шамы падалі калектыўную заяву з просьбаю прыняць іх у калгас. Пад заявай падпісалася 25 беднякоў і сераднякоў з гэтай вёскі. Новыя калгасьнікі паслалі прывітаньне Копыльскаму райкому КП(б)Б і прыступілі да сяўбы на калгасных палёх.

У сувязі з павялічэньнем калгасу калгас павялічыў плян засеву яравых культур.

Калгасьнікі з пасёлкаў «Леніна» і «Малінаўка» абавязваюцца сваімі сіламі і сродкамі пабудаваць сьвінарнік на 150 галоў. Гэта дае калгасу 4000 руб. эканомі.

Трэба адзначыць, што Пясочанскі сельсавет мала цікавіцца жыцьцём калгасаў. Першыя выезды, на поле, якія калгасьнікі правялі ўрачыста, прайшлі бяз удзелу сельсавету. У некаторых калгасах гэта нават затрымала выезды, бо калгасьнікі чакалі на сваю ўрачыстасьць прадстаўнікоў сельсавету, але апошнія не зьявіліся.

Кулакі, абураныя посьпехамі калгасаў, вядуць шалёную антыкалгасную агітацыю, але затрымаць пасьпяховы ход калектывізацыі і веснавой сяўбы ня могуць. Ударная работа на калгасных палёх—моцны ўдар па кулацтву.

Х—ы.



Брыгада калгасу «Чырвоны Араты» за зборкаю сеялкі.

Калгас „Камуніст" па-бальшавіцку

выконвае прынятыя на сябе абавязкі, аб якіх ён праз газэту „Савецкая Беларусь" рапартаваў X зьезду Саветаў

(Бабруйск наш кар.).

Калгас «Камуніст», уключаючыся ў «рапарт мільёнаў» X Усебеларускаму зьезду Саветаў паставіў. перад сабою баявую задачу: пасьпяхова скончыць падрыхтоўку да сяўбы з тым, каб па ўдарнаму правесьці і самую сяўбу ўключыўшыся у «рапарт мільёнаў». Калгас абвясьціў сябе ўдарным.

Веснавая сяўба паказвае, што калгас «Камуніст» зьяўляецца сапраўды ўдарным калгасам, паказваючы ўсім калгасам раёну прыклады бальшавіцкай, ўдарнай работы.

Калгас упаўне падрыхтавана вышаў у поле ў канцы красавіка месяца. Пры выхадзе ў поле, дзякуючы добра пастаўленай арганізацыі працы, кажны калгасьнік добра ведаў свае абавязкі ў часе сяўбы і сваё месца на полі.

Уступаючы ў веснавую сяўбу, калгас не забыўся аб сваім першачарговым абавязку—арганізацыі новага калгаснага прыліву. Стварыўшы вярбовачную брыгаду, калгас «Камуніст» з кожным днём павялічваў свае рады новымі калгасьнікамі. За апошні час, у сувязі з ударнай работай калгасу у часе сяўбы, ў калгас уступіла 14 новых бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Зьдзельшчына паказвае надзвычайна высокую прадукцыйнасьць працы ў калгасе. Калгасьнікі вельмі адабраюць пераход калгасу на зьдзельшчыну. У часе пасадкі бульбы ўстаноўленыя нормы выпрацоўкі ў калгасе былі перавыкананы на 25 проц., па раскідваньні гною—на 50—75 проц. Ёсьць перавышэньне норм выпрацоўкі і па іншых відах работы.

Работа калгасу праводзіцца пры вельмі чоткай працоўнай дысцыпліне. За першую дзесяніднёўку працы не заўважана ніводнага прагулу. Асобныя брыгады распачынаюць працу разам з усходам сонца, даючы ўдарныя паказальнікі працы.

Працоўны энтузіязм калгасьнікаў, разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў працы, пераход на зьдзельшчыну, даюць магчымасьць калгасу скончыць веснавую сяўбу значна раней тэрміну, які вызначаны па пляну. Ужо на 9 мая скончана больш 30 проц. сяўбы.

Калгас «Камуніст» у сваёй рабоце не забываецца і на дапамогу суседнім слабейшым калгасам. Узяўшы калгас «Чырвоны Працаўнік» на грамадзкі буксір калгасьнікі «Камуніста» накіравалі туды сваю брыгаду для дапамогі. Апрача гэтага аказана дапамога калгасу «Заветы Ільліча» і некаторым іншым.

Д. Аланскі.

Ударная праца на полі—выклікае масавы прыліў у калгасы

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Калгасы Плешчаніцкага раёну яшчэ 23 красавіка пачалі сяўбу.

Калгасамі ўзарана 2.285 га пахаці, якой 60 проц. ужо засеяна рознымі культурамі. Сяўба па калгасах праходзіць зараз вельмі пасьпяхова. Калгасьнікі заяўляюць, што 25 мая сяўба ў асноўным будзе скончана.

Уся праца па калгасах праводзіцца пад знакам разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгасы абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньні веснавой сяўбы. Уся работа ў калгасах праводзіцца на асновах зьдзельшчыны.

Ударная работа калгасьнікаў выклікае масавы прыліў у калгасы бядняцка-сераднякіх гаспадарак. На 10 мая па раёне калектывізавана 43,8 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. За дэкаду першамайскага заклiку ў калгасы ўступіла 311 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

А. З—кі.

Памылкі павінны быць выпраўлены

Кантрактацыя яравых культур па Добрагошчанскім сельсавеце. Жлобінскага раёну, праходзіць злачынна марудна. На 1 мая з 11 вёсак сельсавету закончылі кантрактацыю толькі 4 вёскі. Работнікі, якія выяжджалі ў сельсавет па гэтых пытаньнях, недастаткова былі азнаёмлены з інструкцыяй аб кантрактацыі яравых. Працаўнікі сельсавету таксама не пакланяліся своячасова. Пазнаёміцца з адозвай СНК і ЦК пра кантрактацыю яравых. «Ліпавыя інструктары» аднекуль выкапалі, што з 1 га ўраджаю закантрактаванай бульбы трэба здаваць не па 5 тон, а 11 проц. ураджаю. У 4 вёсках кантрактацыя бульбы праведзена па норме 11 проц.

Пасьпяхова праводзяць сяўбу

КОЙДАНАВА, 15-V. (Па тэлефоне ад нашага карэспандэнта). Койданаўскі раён адзін з першых раёнаў у БССР выканаў дырэктывы партыі і ўраду аб 50 проц. калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак да другой бальшавіцкай сяўбы. Паводле зводкі Райза на 15 мая сярэдні процант калектывізацыі па раёне перавышае 50.

Разам з тым, у Койданаўскім раёне ёсьць сельсаветы, якія падыходзяць да суцэльнай калектывізацыі: Нарэйкаўскі—88 проц. і Рубілкаўскі—82,8 проц. Калгасы пасьпяхова праводзяць веснавую сяўбу.

На грошы французскіх імпэрыялістаў Польшча прысьпешана будуе ваенна-стратэгічныя чыгункі

БЭРЛІН, 7 мая. «Дэйчэ тагесцэйтунг» прысьвечвае артыкул будаўніцтву стрэтэгічных чыгунак у Польшчы.

Газэта адзначае, што асабліва буйнае стратэгічнае значэньне будзе мець дзьве буйныя лініі Торк—Сэрпец—Млава—Остраленка—Лапы і Кемпан—Вэлюн—Петракоў—Апатэчна — Радом—Люблін. Гэтыя абедзьве дарогі ў спалучэньні з лініяй Горны Шлёнск—Гдыня задуманы ў першую чаргу як стратэгічныя лініі, на якія будзе абапірацца наступленьне як супроць Нямеччыны, так і супроць СССР.

Разам з гэтым, гэтыя лініі маюць і не малое эканамічнае значэньне. Першая лінія (Торн Лапы) павінна адцягнуць таварныя патокі, якія ідуць з паўночна-ўсходніх частак Польшчы праз Латвію, Літву і Ўсходнюю Прусію ў Данцыг, і накіраваць іх у абход Усходняй Прусіі да Гдыні. Другая, паўднёвая лінія (Кэмпель—Люблін), павінны найкарацейшым шляхам зьвязаць прамысловасьць паўднёва-ўсходняй Польшчы, і перш за ўсё згрупаваную там ваенную прамысловасьць з вугалем Горнашлёнскага басэйну.

Газэта адзначае што пасьля выкананьня праграмы чыгуначнага будаўніцтва Польшча будзе мець 5 стратэгічных чугунак, якія вядуць да граніцы Ўсходняй Прусіі. 7 такіх дарог, якія вядуць да граніц Заходняй Прусіі і Горнага Шлёнску, а таксама 4 чыгункі, якія ідуць уздоўж нямецкіх границ.

Сурова пакараць тых,

хто скрыўляе клясавую лінію ў вёсцы

Апартуністы Пухавіцкага раёну ўтойвалі ад абкладаньня кулацкія гасдадаркі

З матар'ялаў брыгад, якія працавалі на мясцох, выявілася, што ў Талькаўскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, меліся яскравыя выпадкі парушэньняў чыннага законадаўства аб абкладаньні кулацкіх гаспадарак у індывідуальным парадку і поўнага скрыўленьня клясавай лініі.

Цэлы рад яўна кулацкіх гаспадарак ня былі абкладзены у індывідуальным парадку:

АНТАНОВІЧ, які да земляўпарадкаваньня ў 1926 г. меў 200 дз. зямлі, да рэвалюцыі яе здаваў у арэндае карыстаньне, да 1930 г. трымаў сталых батракоў. У 1930 г. карыстаўся наймовай працай ў колькасьці 50 праца-дзён. Пасьля абрэзкі зямлі меў 10.2 дзес., 2 кані, 2 каровы і іншую жывёлу.

ТАТУР, які да 1926 г. меў 360 дз. усіх угодзьдзяў, да 1930 г. трымаў сталых батракоў, потым карыстаўся наймовай працай да 50 праца-дзён, курыў і прадаваў самагон.

БЫЛІНА—да 1926 г. меў 240 дз. зямлі ўсіх угодзьдзяў, эксплёатаваў беднякоў на кабальных умовах, пазычаючы ім збожжа. Да 1930 г. меў сталых батракоў.

ДАМБРОЎСКІ—дзед якога і ён сам былі «потомственные дворяне», да 1926 г. меў 245 дз. зямлі. Пралез у калгас, як серадняк і, калі ў калгасе яго хацелі абкласьці ў індывідуальным парадку, ён падпаіў некалькіх калгасьнікаў і дабіўся таго, што агульны сход калгасьнікаў вынес пастанову аб няправільнасьці яго абкладаньня ў індывідуальным парадку!

Усё гэтыя факты сьведчаць аб злачынна-нядбайных адносінах работнікаў Талькаўскага сельсавету і фінаддзелу Пухавіцкага раёну да сваіх абавязкаў.

Апроч таго, маюцца выпадкі абкладаньня сельскагаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку яўна серадняцкіх гаспадарак. Гаспадаркі гр. гр. Валынецкага сельсавету, Беркавіцкага раёну,—Маёравай Лесі і Фрэйдліна Мордуха. Такі-ж выпадак няправільнага абкладаньня быў у адносінах гр-кі вёскі Сакольнікі, Станькаўскага сельсавету, Сураскага раёну, Сушко-Пятроўскай, якая зьяўляецца настаўніцай у піянэрскай камуне, муж якой кандуктар на чыгунцы і ў гаспадарцы якой маецца 4,25 дз. пахаці, 1,5 дз. лугу, 1 конь, 2 каровы, едакоў 4.

За скрыўленьне клясавай лініі ў абкладаньні, за парушэньне законадаўства, Наркамфін БССР тав ХАЦКЕВІЧ перадаў справу пракуратуры рэспублікі для прыцягненьня ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ТАЛЬКАЎСКІ С-С. І РАЙФІНАДДЗЕЛ ПУХАВІЦКАГА РАЁНУ, А ТАКСАМА РАБОТНІКАЎ ВАЛЫНЕЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, БАРКАВІЦКАГА РАЁНУ І СТАНЬКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, СУРАСКАГА РАЁНУ.

700 тысяч цялят павінны выгадаваць сёлета саўгасы, калгасы і аднаасобныя гаспадаркі БССР

Рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы мерапрыемстваў па гадаваньні цялят

Ударнікі фабрык мяса і малака, вясковы актыў, змагайцеся за выкананьне і перавыкананьне плянаў бальшавіцкай сяўбы, за стварэньне моцнай кармавой базы

Захаваць маладняк

Задача сацыялістычнай рэконструкцыі жывёлагадоўлі, высунутая партыяй і ўрадам, патрабуе самых сур'ёзных адносін да гэтага пытаньня. Вырашэньне гэтага важнейшага мерапрыемства вымагае належнай увагі ня толькі работнікаў, якія прымаюць непасрэдны ўдзел у гэтай справе, але і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў пакінуць на гадоўлю ў гэтым годзе 700.000 цялят, з якіх у саўгасах 22,000, калгасах 330.000 і аднаасобным сэктары—348.000. Паводле пастановы СНК, заданьні па гадаваньні цялят павінны быць даведзены ў парадку самаабавязацельства да кожнага саўгасу, калгасу і бядняцка-сераднякцкага двара. Гадаваньне цялят па кулацка-заможных гаспадарках праводзіцца па цьвёрдых заданьнях.

Як-жа практычна ажыцьцяўляецца гэта важнейшае мерапрыемства?

На запытаньне НКЗ аб тэрміну давядзеньня плянаў гадаваньня цялят да гаспадарак і паасобнага двара толькі 56 раёнаў паведамілі, што пляны даведзены, а рэшта раёнаў зусім не далі аказу. Такая бязьдзейнасьць раёнаў у справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі сьведчыць бязумоўна аб тым, што на мясцох ня ўсюды па бальшавіцку ўзяліся за рэканструкцыю жывёлагадоўлі, што ў шмат якіх мясцох да апошняга часу яшчэ належна не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што пляны па жывёлагадоўлі па некаторых раёнах не даведзены да гаспадаркі і што важнейшае мерапрыемства ўраду ня выконваецца.

Рад раёнаў, якія давялі заданьне па гадоўлі цялят да гаспадаркі і паасобнага двара, значна скарацілі пляны. **Халопеніцкі** раён зьменшыў заданьне на 20 проц., **Клічаўскі**—на 23 проц., **Віцебскі**—на 40 проц. Гэтыя факты сьведчаць аб яўнай недаацэнцы пытаньня жывёлагадоўлі з боку раённых арганізацый.

Але мала давесьці плян да гаспадаркі. Трэба прасачыць за тым, каб яны выконваліся. Трэба сказаць, што РВК і сельсаветы не праявілі належных захадаў, каб дабіцца 100 процантнага захаваньня маладняка. Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў, пытаньне гадаваньня цялят ня стала ў цэнтры ўвагі гаспадарчых арганізацый. Вакол гэтага пытаньня не мабілізавана грамадзкая думка. Маладняк, асабліва цялят, бязьлітасна зьнішчаюць. З месц пастаюць шматлікія весткі аб тым, што дырэктывы ўраду ня выконваюцца, што мерапрыемства па гадаваньні цялят злачынна зрываецца. Ёсьць шмат сельсаветаў, дзе зьнішчаны амаль усе цяляты.

Кулак, шалёна вядзе агітацыю супроць мерапрыемстваў савецкай улады, супроць жывёлагадоўлі, за зьнішчэньне маладняка. Сельсаветы недастаткова арганізавалі бядняцка-сераднякцкія масы, каб даць рашучы адпор кулацкай хлусьні і яго агентуры.

Трэба пакончыць са злачыннымі адносінамі да маладняка. Зараз праходзіць масавы ацёл кароў. Неабходна ўжыць рашучыя меры, каб пакінуць усе цяляты на гадоўлю.

Да гэтага часу РВК і сельсаветы адносіліся фармальна да пытаньня гадаваньня цялят, не вялася рашучая барацьба са зьнішчэньнем маладняку. Вакал гэтага пытаньня недастаткова мабілізавана грамадзкая думка, не наладжаны грамадзкі кантроль над тым, як выконваецца пастанова ўраду аб гадаваньні цялят.

Трэба пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай жывёлагадоўлі.

Трэба дабіцца 100 процантнага захаваньня маладняка.

Ня рыхтуюцца да сіласаваньня кармоў

Вушацкаму раёну нададзены лёнаводна-жывёлагадоўчы напрамак. У зьвязку з гэтым, пытаньню стварэньня кармовай базы павінна быць адведзена вельмі сур'ёзная ўвага з боку раённых і калгасна-каапэрацыйных арганізацый Вушаччыны.

Адным з самых танных і малакагонных кармоў зьяўляецца сілос. У нашым раёне ўжо на практыцы пераконаліся ў вялікай карысьці сілосу, закладзенага ў мінулым годзе. Засіласаваны корм аказаўся вельмі ўдалым і прынёс вялікую карысьць ў сёлетнюю весну.

Аднак, райкалгассаюз і райзагнарующь і не рэалізуюць вопыт мінулага году па сіласаваньні сакавітых кармоў. Да гэтага часу зусім нічога ня зроблена па падрыхтоўцы да сілоснай кампаніі па калгасах Вушаччыны. Райкалгассаюз выпрацаваў плян сіласаваньня на бягучы год, але ён нідзе не абгаворан і недаведзен яшчэ да паасобных сельсаветаў і калгасаў. Плян пасеву сілосных культур ня выконваецца. Райкалгассаюз зусім ня ведае яшчэ, колькі па раёне патрэбна пабудаваць сілосных ям, траншэй і вежаў.

Самацёк у справе падрыхтоўкі да сілоснай кампаніі павінен быць зьнішчан.

Трэба зараз-жа прыступіць да будаўніцтва сілосных установак, трэба ўжо прыступіць да сіласаваньня такіх траў, як асака, аер і інш. кіслыя балотныя травы, ад якіх атрымліваецца вельмі дрэнная сена.

Брыгада «Сав. Бел.». Юрка Росны, Я. Шнэйвайс.



Лепшая агітацыя за сілос

Полацак (наш. кар.). Калгасы **«Новы Шлях»** і імя **Парыскай Камуны**, Полацкага раёну, нядаўна адкрылі сілосныя ямы. Сілос аказаўся вельмі добрай якасьці і значна зьменшыў бяскормицу. Камуна **«Чырвоная Зорка»** таксама атрымала значную колькасьць добраякаснага сілосу.

Адкрыцьцё сілосных ям і вежаў зьявілася лепшым агітатарам за сілос. Калгаснікі парашылі значна пашырыць плошчы пад сілосныя культуры. Вынікі сіласаваньня кармоў у гэтых калгасах зараз вядомы шырокім масам калгасьнікаў і бядняцка-сераднякаму сялянству. Вопыт гэтых калгасаў пераймаецца радам іншых калгасаў раёну.

Базыль Румянец.

Калгас „Вызваленьне" па баявому змагаецца за сьвінагадоўлю

Калгас «Вызваленьне», Ўрэцкага сельсавету, Слуцкага раёну, дае прыклад бальшавіцкага змаганьня за сьвінагадоўлю. Сьвіное стада калгасу складае 40 матак, 15 падсьвінкаў, і 15 парасят. Сьвіньні пастаўлены ў вельмі добрыя санітарныя ўмовы, у сьвінарніку заўсёды чыста, суха, цёпла і сьветла. Яны маюць дабры догляд. Для іх па тры разы ў дзень варыцца цёплы корм.

Уся работа па дагляду сьвіней, як і ва ўсім калгасе, пераведзена на зьдзельшчыну. Ударнікі — сьвінары з вялікім задавальненьнем сустрэлі зьдзельшчыну і з яшчэ большым энтузіязмам ўзяліся за работу. Агульны сход калгасу пастанавіў работу сьвінароў залічыць, як цяжкую, ацэненую ў 1¼ працадні.

Калгас «Вызваленьне» зараз прыступіў да будаўніцтва сьвінарніку на 96 станкоў. Сьвінарнік будзе каштаваць 16.000 руб. Калгасам вывезена для пабудовы сьвінарніка 250 куб. мтр. леса матар'ялу.

Л. Хаўкін.

Злачынныя адносіны да жывёлы

У калгасе **«Маяк Рэвалюцыі»**, Радамскага сельсавету, Чаўскага раёну, нядбайна адносяцца да дагляду за жывёлай. У апошні час у калгасе без ніякой прычыны загінулі 3 каровы і жарабок. Вельмі дрэнна пастаўлен дагляд за жывёлай і ў аддзяленьнях калгасу Радуча, **«Беларуская Вёска»** і Чыж, дзе пануюць злачынныя адносіны да жывёлы.

У калгас **«Маяк Рэвалюцыі»** залезьлі шкоднікі, якія імкнуцца разваліць калгас і падарваць яго аўтарытэт у вачох аднаасобнікаў.

Трэба ўздараваць калгас і выкінуць з яго усіх шкоднікаў.

Ян. Журын.

Сельсавет патурае злачынцам

Па Заборскім сельсавеце, **Чарэйскага раёну**, наглядаецца масавае зьнішчэньне маладняка... Гаспадары, у якіх ацяліліся каровы, перарэзалі амаль усіх цялят.

Асабліва шмат цялят паглумілі ў в. Бобрык, дзе не пакінуў на гадоўлю ніводнага цяляці.

Сельсавет ўсё гэта бачыць, але ня прымае захадаў, каб спыніць злачынства. Задача разьвіцьця жывёлагадоўлі мала абыходзіць Заборскі сельсавет. Ня было выпадку, каб хоць адзінага гаспадара аштрафавалі за забой цялят.

Судовыя органы павінны напомніць Заборскаму сельсавету, як павінна выконвацца пастанова ўраду аб гадаваньні цялят.

Р-на.

ДАЦЬ АДПОР КУЛАЦКАЙ АГІТАЦЫІ

У в. в. Таракі, Ламюны і Тараканы, Дамавіцкага сельсавету, Мазырскага раёну, парэзалі шмат цялят, таксама вінчаць маладняк і па іншых вёсках сельсавету. Кулакі агітуюць за зьнішчэньне маладняка і падбухторваюць на гэта несьвядомых бяднякоў і сераднякоў.

Аднаасобны сэктар сельсавету дрэнна падрыхтаваўся да сяўбы, насеньне ачышчана вельмі мала, с-г інвэнтар ня скончылі рамонтаваць.

Сельсавет глядзіць скрозь пальцы, як глумяць цялят, ён не арганізаваў бядняцка-сераднякцкія масы, каб даць рашучы адпор клясаваму ворагу, не мабілізаваў усе магчымасьці, каб ударна правесьці бальшавіцкую сяўбу.

Сельсавет павінен на хаду выправіць слабыя вучасткі работы.

Трэба сурова забараніць зьнішчэньне маладняка.

М. Міцкевіч, А. Кузьмянок.

За зьнішчэньне маладняка—да адказнасьці

Па вёсках Ігрушацкага сельсавету, Крупскага раёну, бязьлітасна зьнішчаецца маладняк. Ігрушацкі сельсавет ня выконвае дырэктыў партыі і ўраду аб гадаваньні маладняка. Бядняцка-сераднякцкія масы, знаходзячыся пад уплывам кулацкай агентуры, рэжуць цялят. Зьнішчаюць маладняк нават і тыя гаспадаркі, якія закантрактавалі свае цялят.

Сельсавет ня прымае ніякіх захадаў, каб спыніць драпежны забой маладняка; у адносінах да тых гаспадарак, якія злосна зьнішчаюць маладняк, сельсавет ня ўжывае ніякіх мер узьдзейнічаньня.

РВК і Ігрушацкі сельсавет павінны рашуча спыніць зьнішчэньне маладняка і ўстанавіць кантроль над тым, як выконваюцца дырэктывы ўраду аб гадаваньні цялят.

С—кор.



Дзьве сілосныя вежы ў калгасе «Энгельса», Уваравіцкага раёну.

Жывёла не ў пашане

У калгасе **«Трудавік»**, Баяўскага сельсавету, Ляднянскага раёну, жывёла знаходзіцца не ў пашане. У калгасе не арганізован належны дагляд за жывёлай, каровы стаяць па калена ў гразі. Ад дрэннага дагляду жывёла хварэе і нават гіне. З прычыны дрэннага дагляду ў калгасе загінула шмат цялят.

Баяўскі сельсавет і праўленьне калгасу павінны зараз-жа зьнішчыць усё недахопы ў даглядзе за жывёлай.

К. К.

Спыніць забой маладняка

— Па Ўсохскім с.-с., Клічаўскага раёну, ня выконваецца дырэктыва ўраду аб 100-процантным захаваньні маладняка. Сельсавет нават не арганізаваў вучоту, колькі цялят гадуецца па вёсках.

У сельсавеце наглядаецца масавы забой цялят. Члены сельсавету ня цікавяцца гэтым пытаньнем і глядзяць скрозь пальцы на зьнішчэньне маладняка.

Сельсавет таксама нічога не арабіў, каб выканаць цалкам пляны загатовак па грубых кармох. Саўгас Бацевічы адчувае вялікую патрэбу ў кармох, але сельсавет не аказвае саўгасу ніякай дапамогі, каб спагнаць з кулакоў цьвёрдыя заданьні.

Органы пракуратуры павінны прыцягнуць да адказнасьці тых якія зьнішчаюць маладняку па Ўсохскім раёне.

М. Д-ў.

Шкоднікаў—пад суд!

У Копыскім раёне ня выконваецца дырэктыва ўраду аб гадаваньні цялят. Вакол гэтага пытаньня ня створана грамадзкая думка. Наглядаецца масавы забой маладняка па раёне. Вэтэрынары (Старасельскі) і інш. за чарку гарэлкі выдаюць справкі аб ягодчасьці цяляці і апошняе ідзе пад нож.

РВК і мясцовая ўлада бязьдзейнічаюць у гэтым пытаньні. Старасельскі і інш. сельсаветы нават выдаюць справкі аб дазволе рэзаць добрапрадукцыйных кароў.

Асабліва бязьлітасна зьнішчаецца маладняк па **Дуброўскім** і **Старасельскім** сельсаветах. Між тым, старшыня Старасельскага сельсавету Розэнман заяўляе, што «па сельсавеце не наглядаецца забой маладняка»(?!).

Ня лепш абстаіць справа і з даглядам за жывёлай. У калгасах **«Зара»**, **«Новае Жыцьцё»** і інш. шмат кароў не ўстае.

Шкоднікаў трэба аддаць пад суд!

РСІ і райпракуратура павінны неадкладна ўмяшацца ў гэту справу.

Ударная селькор. брыгада «Савецкай Беларусі».

Росман, А. Генін, А. Шураў, Я. Каган.

Левая рука ня ведае, што робіць правая

Па Чарэйскім раёне наглядаецца масавы забой маладняка. Па грубым падліку, за апошнія 2 месяцы па раёне забита звыш 3000 цялят.

І гэта робіцца ў той час, калі РВК выдае пастанову аб забароне зьнішчэньня маладняка. Цікава адзначыць, што Скурсындыкат нібы-та нічога ня ведае пра забарону забойства цялят і вельмі спакойна праводзіць загатоўкі зосскаў з зарэзаных цялят.

Усё раённыя арганізацыі добра ведаюць пра зьнішчэньне цялят, але ня прымаюць ніякіх захадаў, каб спыніць гэтае злачынства. Кантрактацыя цялят не праводзіцца. Райкаапсаюз праяўляе поўную бязьдзейнасьць у гэтай галіне.

Трэба палажыць канец бяздушным і прымірэнчым адносінам да пытаньня жывёлагадоўлі па Чарэйскім раёне.

Райком КП(б)Б і Рай РСІ павінны ўмяшацца ў гэту справу.

Таганові ч.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 109 (3197)

Усе сілы, усе сродкі—на поўнае выкананьне пляну адгрузкі насеннай бульбы

14 МАЯ

БЕЛКААПСАЮЗ адгрузіў 144,8 тоны насеннай бульбы, з іх у Ленінградзкую вобласьць—80,9 тон і для прыгарадных гаспадарак Масквы—63,9 тон, а таксама 128,9 тоны сталовай бульбы, што складае разам 273,7 тоны.

БЕЛЛЁНАСАЮЗ адгрузіў насеннай бульбы 15 тон для Украіны і 46,2 тон у Ленінградзкую вобласьць.

Плян адгрузкі з БССР насеннай бульбы выкапан на 20,1 прычым у Ленінградзкую вобласьць—на 12,7 проц., для прыгарадных гаспадарак Масквы—на 21,2 проц. і на Украіну—на 62,2 проц.

За 12 мая—258,6 тон
За 13 мая—382,8 тоны
За 14 мая—334,9 тоны

Спагнаць цьвёрдыя заданьні

Вельмі многа гаварылася аб неабходнасьці ўжыць безадкладныя рашучыя захады да кулакоў, якія не здаюць цьвёрдых заданьняў бульбы. Усім вядомы дырэктывы партыі і ўраду аб гэтым. Не адзін раз чацьвёрка па бульбазагатоўках пры СНК падкрэсьлівала неабходнасьць безадкладнага спагнаньня бульбы па цьвёрдых заданьнях і абавязвала райвыканкомы заняцца гэтай справай.

Аднак, становішча са спагнаньнем бульбы па цьвёрдых заданьнях у некаторых раёнах гаворыць аб апартуністычнай недаацэнцы гэтай справы з боку паасобных райвыканкомаў. Так, Буда-Кашалёўскі раён спагнаў 62 пр. цьвёрдых заданьняў, Быхаўскі — 59 проц., Горацкі — 78 проц., Дубровенскі — 72 проц., Заслаўскі — 63 проц., Крупскі — 61 проц., Ляднянскі — 53 проц., Лепельскі — 64 проц., Магілёўскі — 59 проц., Парыцкі — 42 пр., Рагачоўскі — 44 проц., Сьвіслацкі — 33 проц., Чавускі — 68 проц., Чэрвенскі — 70 проц. А між тым, паказаныя раёны маюць нарады на адгрузку бульбы ў першую чаргу на насеньня, а таксама і сталовыя, патрэбы пралетарскім цэнтрам Саюзу.

Да гэтага часу ні ў адным раёне, за выключэньнем Крупскага, ніякага зруху ў адгрузцы бульбы няма. Асабліва трэба падкрэсьліць дрэнную работу ў адгрузцы бульбы **Парыцкім, Рагачоўскім, Быхаўскім і Чавускім** раёнамі, якраз тымі раёнамі, якія ня прынялі належных захадаў да спагнаньня бульбы з кулакоў.

Адпаведныя органы павінны паказаць пералічаным райвыканкомам, як трэба падыходзіць да справы спагнаньня бульбы з кулацкіх гаспадарак, каб патураньнем кулаку не тармазіць адгрузкі бульбы.

С. П.

Гандлярскі апэтыт Савостава зрывае адгрузку

У Дняпроўскай камуне, Лоеўскага раёну, ёсьць 1000 тон бульбы, загатоўленай для крухмальнага заводу. Завод скарыстаць яе цяпер ня мае магчымасьці, з прычыны таго, што ня скончан пабудоваю. У зьвязку з гэтым Белсадгародніна, для таго, каб фарсыраваць адгрузку бульбы, дала нарад адгрузіць гэтую бульбу на Украіну.

Яшчэ 8 мая па запатрабаваньні Белсадгародніны Дняпроўскае параходства падало баржу зьмяшчэньнем у 600 тон для адгрузкі гэтай бульбы. Замест таго, каб безадкладна пагрузіць бульбу на баржу і накіраваць яе ў Днепрапятроўск—буйны рабочы цэнтр Украіны, Лоеўскі райкаапсаюз у асобе тар. **Савостава** аж на 5 дзён зацягнуў злачынную бюракратычную праціску наконт цаны за гэтую бульбу, патрабаваўшы 52 руб. 43 кап. за тону, папярэджваючы, што, калі гэтая цана яму ня будзе дадзена, ды ён адгрузіць бульбу—на свой погляд—у іншы адрас. З боку т. Савостава таксама адпаведных органаў раёну ня гледзячы на неаднаразовыя прапановы паскорыць адгрузку, бо на Украіне зрываецца сяўба, была праяўлена самая недапушчальная гандлярская пастаноўка пытаньня, якая затрымала адгрузку патрэбнай Украіне бульбы, выніку чаго бульба і па сёньняшнім дзень не адгружана.

Пракурор рэспублікі павінен тэрмінова запрапанаваць Лоеўскаму райпракурору прыцягнуць старшыню праўленьня райкаапсаюзу Савостава да крымінальнай адказнасьці за сьвядомае затрыманьне адгрузкі бульбы на Украіну і вымушаны прастой баржы,—гэтага патрэбнага ў сучасны момант сродку транспарту.

Пост газэты «Савецкая Беларусь».

Прэабражэнскі.

Перадаем наш вопыт работы

Для практычнай дапамогі ў рабоце калгасу «Чырвоная зьмена» паслала свайго работніка ў калгас «Бязбожнік», Лёзьненокага раёну. Гэты калгас мы ўзялі для таго, каб зрабіць яго узорным, вопытна-паказальным калгасам.

З чым мы сустрэліся ў практычнай рабоце ў калгасе?

Вытворчы плян калгасу—гвозд усёй работы. Плян калгасу быў складзен зусім дрэнна і нежыцьцёва. У гэты плян ніхто ніколі не заглядваў, у гэтым пляне нічога нельга было зразумець.

Брыгада «Чырвонай Зьмены», сумесна з праўленьнем і вытворчай нарадай калгасу, перарабіла плян, канкрэтызавала яго да дробязяй. У пляне вялася дома, колькі і якія культуры калгас будзе сеяць, у якім парадку. Выходзячы з гэтага мы ўстанавілі, якія культуры будзем сеяць раней, колькі дзён трэба для правядзеньня той ці іншай работы, якая брыгада будзе выконваць работу, і куды яна перакідваецца пасьля сканчэньня гэтай работы. Такім чынам календарызавалі работу ў калгасе аж да ўборкі.

Раней у калгасе было такое становішча, што калгасьнікі ня былі на сталай рабоце, часта мяняліся, ніхто не меў прымацаваных сродкаў вытворчасьці і т. д., ня было канкрэтнай адказнасьці.

Мы распрацавалі плян ліквідацыі абязьлічкі, кожнаму калгасьніку далі поўнай работы прымацавалі плуг. кані і г. д. на пэўны абмежак часу. Галоўны упор рабілі на тое, каб гэты абмежак часу быў больш доўгім. На скотным двары да кожнай даільшчыцы прымацавалі пэўную колькасьць кароў, да кожнага конюха пэўную колькасьць коняй. Вынікі ад гэтага вялізарныя.

Цяпер ужо каля праўленьня ня будзе бесталковай бегатні. Цяпер брыгады маюць цьвёрды плян, прастояў прагулаў ня будзе. Брыгада атрымлівае нарад на пэўны пэрыод работы калгасьнік, зьяўляючыся на работу ведае, які конь да яго прымацаваны дзе знаходзіцца яго плуг і што ён будзе рабіць. Кожны калгасьнік нясе конкрэтную адказнасьць за даручаную яму работу, за інвэнтар і г. д.

Брыгада дапамагла калгасу арганізаваць, наладзіць работу вытворчых нарад, ператварыўшы іх у баявы штаб работы калгасу.

Дэпутацкія групы—аснаўное зьвяно ГАРСАВЕТАЎ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Віцебскі гарсавет, прыняўшы выклік Менску, рашуча перабудоўвае сваю работу. Чакаем адказу Гомелю на выклік Менскага гарсавету

Стаяць у баку ад савецкай работы

Нашы прапановы Барысаўскаму гарсавету

Пры праверцы брыгадай газэт **«Савецкая Беларусь»** і **«Бальшавік Барысаўшчыны»** становішча з арганізацыяй і наладжваньнем работы дэпутацкіх груп на прадпрыемствах Барысава высьветлілася, што ў гэтай справе ў **Барысаве маецца ганебны прарыў.**

Дэпутацкія групы створаны толькі на трох прадпрыемствах: **«Чырвонай Бярэзіне»**, гуце імя Домбаля і заводзе **«Камінтэрн»**. На астатніх прадпрыемствах дэпутацкія групы не арганізаваны.

Але калі мы паглядзім на дзейнасьць створаных дэпутацкіх груп, дык стане зразумелым, што і яны фактычна яшчэ не працуюць.

На **«Чырвонай Бярэзіне»** і гуце імя Домбаля дэпутацкія групы арганізаваны амаль 2 месяцы таму назад, а дагэтуль яны яшчэ нават ня маюць плянаў работы.

Парт'калектывы і фабкомы гэтых і іншых прадпрыемстваў Барыса стаяць у баку ад савецкай работы і палец аб палец не ўдараюць, каб яе наладзіць.

Побач з гэтым у працэсе арганізацыі дэпутацкіх груп дапушчаны і дапушчаюцца рад памылак.

Барысаўскі Гарсавет лічыць, што дэпутацкія групы павінны быць арганізаваны толькі на тых прадпрыемствах, на якіх маецца вялікая колькасьць дэпутатаў. Выходзячы з гэтага, намесьнік старшыні Барысаўскага Гарсавету тав. Катко кажа: **«Мы лічым непатрэбным і немэтазгодным стварань дэпутацкія групы на тых прадпрыемствах, дзе маецца толькі 3-4 дэпутаты» (?!).** Тав. Катко, а разам з ім і ўвесь Гарсавет ня ведае, што дэпутацкія групы павінны быць арганізаваны на ўсіх тых прадпрыемствах, якія налічваюць 3 дэпутаў Гарсавету. Больш таго, Барысаўскі Гарсавет не разумее дагэтуль, што «дэпутацкая група» і «старастат»—гэта адно і тое-ж.

Апрача ўсяго гэтага, пры арганізацыі дэпутацкіх груп, зроблена яшчэ адна вельмі значная памылка. Па дырэктыве Барысаўскага Гарсавету дэпутацкія групы на прадпрыемствах **арганізоўваюцца выключна з дэпутатаў і кандыдатаў у члены Гарсавету, без прыцягненьня да сталай работы групы шырокага савецкага актыву з рабочых.** Барысаўскі Гарсавет лічыць зусім натуральным такое зьявішча, калі на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» дэпутацкая група складаецца выключна з 50 дэпутатаў і членаў у Гарсавет.

— Потым, пасьля таго, як мы разаб'ём групу на брыгады, да іх будуць прыцягнуты рабочыя—кажа тав. Катко.

Гэтыя словы вельмі яскрава сьведчаць аб тым, што Барысаўскі Гарсавет не разумее, што толькі пры ўдзеле шырокага савецкага актыву з рабочых у рабоце самой дэпутацкай групы, што толькі абапіраючыся на гэты актыў можна падняць на належную вышыню савецкую работу на прадпрыемстве і ажыцьцявіць сапраўдны паварот Гарсавету тварам да вытворчасьці.

Што-ж неабходна зрабіць для выпраўленьня дапушчаных памылак, і для таго каб як сьлед паставіць савецкую работу?

Барысаўскі Гарсавет перш за ўсё павінен дэталёва вывучыць асноўныя палажэньні аб рабоце дэпутацкіх груп. Неабходна склікаць агульна-гарадзкую інструкцыйную нараду фабзаўкомаў усіх тых прадпрыемстваў, якія налічваюць адпаведную колькасьць дэпутатаў Гарсавету (пачынаю ад 3-х дэпутатаў, ці 2-х дэпутатаў і аднаго кандытата).

Самым тэрміновым парадкам неабходна скласьці і абгаварыць на рабочым актыве пляны работы створаных дэпутацкіх груп. Гэтыя-ж групы павінны зараз-жа перабудаваць сваю работу так, каб прыцягнуць да сябе шырокія колы савецкага актыву (нарзасед. тав. суды, камсоды і інш.).

Райком партыі і Райпрафсавет павінны тэрмінова праверыць ролю нізавых партыйных і прафсаюзных арганізацый у справе наладжваньня савецкай работы. Бязьдзейнасьці парт'чэек і ФЗК у гэтай справе павінен быць паложан канец.

Мы патрабуем, каб усе вышэйадзначаныя канкрэтныя прапановы нашай брыгады былі ажыцьцяўлёны не пазьней 25 мая, каб у наступным рэйдзе мы мелі магчымасьць праверыць іх выкананьне.

Брыгада «Сав. Бел.» і «Бальшавік Барысаўшчыны»:

С. Громаў, Салавейчык, Няхай, Зомэрфэльд, Ярашэвіч, Казак і Мазо.

Работніца заводу «Бальшавік» тав. Нахамава—старшыня дэпутацкай групы заводу.

Рашуча ажывіць работу сэкцый

Віцебскі Гарсавет намеціў і пачаў ужо праводзіць цэлы рад мерапрыемстваў, якія павінны зьвязваць Гарсавет з вытворчасьцю. Гэтымі мерапрыемствамі зьяўляюцца: дэпутацкія групы, прыёмныя дні, Інстытут па-за штатных інструктароў, сац. сумяшчэньне і прыцягненьне да работы ў савеце шырокага актыву. Гэтыя мерапрыемствы зьяўляюцца галоўнейшымі на шляху перабудовы работы Гарсавету, павароту яго тварам да вытворчасьці.

Але ня гледзячы на вялікае палітычнае значэньне кожнага з гэтых мерапрыемстваў, ня гледзячы на катэгарычныя пастановы Гаркому КП(б)Б нізавыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі да апошняга дню ня здолелі іх ажыцьцявіць.

Дэпутацкія групы яшчэ ня ўсюды створаны, а існуючыя ня маюць дастатковага кіраўніцтва і дапамогі.

Прыёмныя дні праводзяцца не па пляну, стыхійна, з-за чаго яны не даюць таго эфэкту, які-б яны маглі і павінны даць.

Марудныя тэмпамі ажыцьцяўляецца вылучэньне па-за штатных інструктароў і вылучэньне рабочых ад варштату па сац.-сумяшчэньні. Масавая работа сельсаветаў не адпавядае задачам, якія стаяць перад імі.

Сацыялістычны дагавор з Менскім Гарсаветам патрабуе паставіць работу сэкцый так, каб яна адпавядала найхутчэйшаму выкананьню ўсіх задач, якія стаяць перад намі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Але мы павінны адзначыць, што да гэтага часу сэкцыі Віцебскага Гарсавету яшчэ не перабудавалі сваёй работы адпаведна гэтым задачам. Мы маем нават факты бязьдзейнасьці некаторых сэкцый. Прамысловая сэкцыя, якая зьяўляецца галоўным нэрвам Гарадзкога савету, яшчэ не разгарнула сваёй работы дзякуючы дрэннаму кіраўніцтву Бюро сэкцый. Прэзыдыум Гарсавету быў прымушаны перабрабць Бюро сэкцый і яе старшыню. Пытаньне пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разьлік і заключэньне дагавароў—адно з першарадных палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў партыі і ўраду,—сэкцыя не абмяркоўвала. Пытаньне аб укараненьні вытворчай тэхнікі ў масы сэкцыяй таксама не прапрацоўвалася.

Сэкцыя Нарасьветы не праводзіла ніводнага паседжаньня бюро за ўвесь час яе існаваньня, а старшыня т. Будневіч усякімі агаворкамі адмяжоўваецца ад кіраўніцтва сэкцыяй. Фінансавая сэкцыя не разгарнула масавай работы вакол аднаразовага культурнага збору і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Ніводная сэкцыя не займалася пытаньнямі дапамогі сельсаветам у перабудове іх работы і аб сапраўдным ажыцьцяўленьні шэфства прадпрыемстваў над дзяржустановамі. Усе гэтыя недахопы павінны быць на падставе пастановы VI зьезду Саветаў ліквідаваны і на грунце самапаборніцтва кожная сэкцыя павінна дабіцца належнай пастаноўкі абслугоўваньня вёскі, пры цягненьня і максымальнага скарыстаньня прымацаванага актыву, лепшай і сыстэматычнай сувязі з дэпутацкімі групамі, 100 процантнага наведваньня пленумаў, хутчэйшага і чоткага выканаьня ўсіх задач, якія перад ім паставлены парткіраўніцтвам. Брыгады сэкцый не павінны насіць выключна абсьледавацельскага характару, як гэта робіцца зараз. Работа брыгад павінна быць у кожным выпадку накіравана на выяўленьне прычын, канкрэтных вінавайцаў прарываў і на мабілізацыю іх ліквідацыі. Толькі такая работа брыгад адпавядае перыяду калі Гарсавет павінен быць органам мабілізацыі мас на пасьпяховае заканчэньне будаўніцтва сацыялістычнай эканомікі.

Цукерман.

Старшыня бытавой сэкцыі Менгарсавету тав. Саф'ян.

ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ ТОЛЬКІ АФОРМЛЕНЫ

У Віцебску з боку некаторых партыйных і прафэсыянальных арганізацый мела месца апартуністычная недаацэнка ролі дэпутацкіх груп, апошнія ня ўсюды яшчэ створаны, а ўжо створаныя ня мелі ніякай дапамогі ў сваёй рабоце з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый на мясцох.

Гэтым пытаньнем занялося Бюро Гаркому партыі, якое прапанавала ўсім партыйным калектывам і ячэйкам, фракцыям ФЗМК, фракцыі Гарсавету і Гарпрафсавету да 10 мая скончыць стварэньне дэпутацкіх груп.

Дырэктыва Гаркому аб стварэньні дэпутацкіх груп на вытворчасьці зараз ужо выканана. Масавым аддзелам Гарсавету склікаецца нарада Бюро дэпутацкіх груп, дзе будзе пастаўлен даклад аб іх значэньні і рабоце.

Н. Д. і С. М.

Па-ўдарнаму за работу

Адкрыт у Віцебску габінэт савецкага будаўніцтва

На днях Віцебскім Гарсаветам была склікана нарада ўсіх Бюро сэкцый Гарсавету. Галоўным пытаньнем на гэтай нарадзе зьяўлялася—ажыцьцяўленьне сац. умовы заключанай паміж Менскім і Віцебскім гарсаветамі і аб сапраўдным павароце сэкцый тварам да вытворчасьці і калгаснага будаўніцтва.

Каторыя Бюро дрэнна кіравалі работай сэкцый (прамысловая, РСІ). Маюцца выпадкі зрыву паседжаньняў Бюро, прамысловая сэкцыя не падрыхтоўвае пытаньняў Пленуму.

На нарадзе высьветлілася, што амаль ніводная з сэкцый не займалася пытаньнем работы на вёсцы і ніякай сувязі з вёскай да апошняга часу ня мела. На гэтай нарадзе выступаўшыя адзначылі, што прэзыдыум і масавы аддзел гарадзкога савету не намецілі мерапрыемстваў па рабоце на вёсцы, ня гледзячы на тое, што месяц таму назад скліхалася нарада Бюро сэкцый і даручыла масавым аддзелу гэтае пытаньне выпрацаваць. Шмат увагі на нарадзе зварочалася пытаньню ненаведваньня членамі і кандыдатамі гарадзкога савету і асабліва прымацаванымі да пленумаў сэкцый брыгад і пленумаў гарадзкога савету. Партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі ніякіх мер ня прымаюць да ненаведваючых і слаба ўдзельнічаючых у рабоце гарадзкога савету.

Нарада намеціла рад мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні работы сэкцый і іх павароце тварам да вытворчасьці, да калектывізацыі і выкананьня сац. умовы, заключанай паміж Менскім і Віцебскім гарсаветамі. Нарада прапанавала ўсім сэкцыям сыстэматычна накіроўваць у вёску брыгады для правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній.

25 актыўных членаў гарадзкога савету вылучаны па-за штатамі інструктарамі гарадзкога савету.

Сэкцыям прапанавана зьвярнуць асаблівую ўвагу на работу з актывам і ўцягненьне шырокіх колаў рабочых у работу гарадзкога савету. Нарада вынесла пастанову аб сыстэматычнай праверцы выкананьня пастаноў і рашэньняў прэзыдыуму савету і яго сэкцый.

Нарада выказалася за адкрыцьцё ў Віцебску габінэту савецкага будаўніцтва.

Гэта нарада павінна зьявіцца пераломным пунктам ва ўсёй рабоце Віцебскага Гарсавету і яго сэкцый.

Брыгада газ. «Сав. Бел.» Н. Дварсон і Міркін.

САПРАЎДНАЕ РАБОЧАЕ ШЭФСТВА
ПАСКОРЫЦЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ ВЕСКІ

Аршанскія: хлебазавод, канатная фабрыка, шавецкая арцель „Чырвоная Зорка“ тэкстыльны тэхнікум, гарсавет і прафсавет не вядуць работы ў падшэфных вёсках

Вучыцеся на вопытах заводу „Бальшавік“, добрая шэфработа якога выклікала прыліў у калгасы

Аршанскія шэфы! Вас чакаюць падшэфныя вёскі

Над Пугляеўскім сельсаветам (Аршанскі раён) шэфствуе заўком Аршанскага Хлебазаводу і саюз Харчавікоў. Работнікі ў Пугляеўскім сельсавеце слабыя. Ім патрэбна дапамога, але шэф не дапамагае. У пачатку падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, шэф—заўком Хлебазаводу неяк удасужыўся паслаць у падшэфны сельсавет свайго прадстаўніка. Паглядзеў той, што робіцца ў сельсавеце, пабываў у некаторых калгасах, убачыў, што сапраўды патрэбна падшэфнаму сельсавету іх дапамога і адразу заявіў там:

— Мы вам прышлем брыгаду, якая дапаможа давесьці пасеўныя пляны да дзара.

— Вялікае дзякуй мы вам скажам, дарагія таварышы,—адказалі сельсаветчыкі прадстаўніку шэфа,—калі прышлеце. Самі мы ня можам справіцца. Дапамажэце нам.

Старшыня заўкому—Лубяга, абяцаў паслаць брыгаду:

— Як-жа, пашлем, абавязкова пашлем, а то шэфстваць то шэфствуем, але яшчэ нічога ў сваім падшэфным сельсавеце не зробілі.

Але абяцаньні шэфа, так і засталіся абяцаньнямі. Работнікі Пугляеўскага сельсавета і па сёньняшні дзень чакаюць дапамогі ад шэфа, а яна, на вазах едзе.

* * *

Над калгасам «Чырвоны берег» шэфствуе шавецкая арцель «Чырвоная Зорка» і саюз Дрэваапрацоўшчыкаў. Тут шэфства зьяўляецца толькі ў тым, што шэфы і падшэфныя бываюць адзін у другога толькі ў дні рэвалюцыйных сьвят. Работы ў калгасе шэфы ніякай не вядуць, ня гледзячы на тое, што яе абавязкова патрэбна праводзіць асабліва ў гэтым калгасе, як у інтэрнацыянальным.

* * *

Над калгасам «Ларынаўка» шэфствуюць многія. Калгаснікі ўжо і лік сваім шэфам згубілі, яны кажуць, калі з імі загаворыш аб шэфах:

— Ня ведаем мы сваіх шэфаў. Прыяжджала многа прадстаўнікоў і ня раз прыяжджалі, і ўсё гаварылі, што яны над намі будуць шэфствацъ, але работы ў нас ніякай не праводзілі. Шэфаў мы бачым толькі ў той дзень, калі яны прыяжджаюць оказаць нам, што над намі шэфствуюць.

А між тым над «Ларынаўкай» шэфствуе і Аршанскі Гарсавет, і Сампрамсаюз, і Канатная фабрыка, і Тэкстыльны тэхнікум.

Гэты калгас—вялікая прыгарадная малочная фэрма. У час падрыхтоўкі да сяўбы яму патрэбна дапамога з боку шэфаў, але апошнія нічога ня робяць.

* * *

Над Бразыдзечынскім сельсаветам шэфствуе саюз Мэдсанпрацы. Але калі прыпылося дапаматчы падшэфнаму сельсавету ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, ніхто з членаў прафсаюзу не згадзіўся ў сельсавет ехаць. І толькі ўжо ў сакавіку месяцы, саюз неяк здолеў вылучыць брыгаду для пасылкі ў падшэфны сельсавет. А між тым, на агульным сходзе саюзу мэдсанпрацы, калі разглядалася пытаньне аб удзеле ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы,—увесь сход абвясьціў сябе мабілізаваным на дапамогу ў веснавой сяўбе.

Саюз працмастацтва вынес пастанову паслаць брыгаду для культурнага абслугоўваньня калгасаў у час падрыхтоўкі да сяўбы. Гэта пастанова так і засталася на паперы.

Але чаго жадаць ад асобных прафсаюзных арганізацый, калі Райпрафсавет забыўся аб веснавой пасеўкампаніі. Праўда, ён яшчэ 15 студзеня абгаварыў пытаньне аб удзеле прафсаюзаў у пасеўкампаніі, даў заданьні ўсім прафсаюзам, і ўсё. А праверыць, як яны выконваюць гэтыя заданьні,—ён і не падумаў. Наогул Райпрафсавет не цікавіцца тым, як прафсаюзы ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

А. Кудрын.

Бярыце прыклад з „Бальшавіка“

Наш завод **«Бальшавік»** шэфствуе над Самахвалавіцкім і Гатаўскім сельсаветамі. Да нядаўнага часу гэтае шэфства насіла кампанейскі характар: ад сьвята да сьвята выяжджалі некалькі чалавек правесьці ўрачыстае вечар — і ўсё. Рабочая маса заводу мала ведала аб гэтым шэфстве.

Зараз, у сувязі з абвяшчэньнем Гаркомам КП(б)Б конкурсу на лепшае правядзеньне шэфства і калектывізацыі, заводзкая грамадзкасьць сур'ёзна ўзялася за гэтую справу. На першамайскія сьвяты былі запрошаны ў горад з падшэфных сельсаветаў каля 80 чал. З іх частка ўступіла пасьля гэтага ў калгасы. Шэфства разьбіта па прынцыпу брыгад, г. зн. да кожнай брыгады прымацавана асобная вёска. Сход ударных брыгад вынес пастанову аб выезьдзе кожнай брыгады ў выходны дзень 1 раз у месяц ў вёску. Такім чынам, кожны дзень выяжджае група выходных ударнікаў у вёску. На днях быў калектыўны выезд усіх парторгаў у вёску.

З падшэфнымі сельсаветамі заключана сац. умова у якой абодвы бакі бяруць на сябе фад абавязацельстваў. У шматтыражцы асьветляецца на спэцыяльнай старонцы работа падшэфных сельсаветаў. Мы ўжо маем першыя вынікі—значны рост калгасаў, узмацняецца іх работа. Наш завод уключыўся ў конкурс на пераходны сьцяг за лепшае правядзеньне шэфства. Мы ўпэўнены ,што наш завод, які выпаў пераможцам на ўсебеларускім конкурсе, выйдзе і на гэты раз пераможцам.

Мінькін.

Ажывіць работу

раённых таварыстваў садзейнічаньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі

XVI зьезд УсеКП(б) і XIII зьезд КП(б)Б па пытаньні садзейнічаньня гораду ў справе калектывізацыі вёскі абавязалі прафсаюзы праводзіць работу па арганізацыі батрацтва, па ўзмацненьні калектывізацыі. Але да гэтага часу пастановы зьездаў у жыцьцё не праводзяцца.

Прафсаюзы нічога ня робяць ня глядзячы на тое, што шэфства рэарганізавана. Арганізаваны кустаб'яднаньні РТСКСГ пры заводзе «Энэргія», у якія ўваходзіць 19 устаноў г. Менску. Такія-ж кустаб'яднаньні арганізаваны і пры іншых заводах («Камунар»).

З першых дзён, як быццам, нешта ў іх рабілася: зьбіраліся трошы на трактарныя абавязацельствы, накіроўваліся рабочыя брыгады на раён і г. д. Але за апошні час у працы гэтых аб'яднаньняў і наогул у РТСКСГ поўнае маўчаньне. Вакол шэфства рабочыя масы не мабілізуюцца. Вярбоўка новых членаў сярод рабочых і служачых не вядзецца. З часу рэарганізацыі ў кустаб'яднаньнях і шэфтаварыствах прадпрыемстваў і ўстаноў членскія білеты, якія павінны выдавацца ўноў уступаючым, адсутнічаюць па ўсім Менску. ЦСБ мэталістаў, скурнікаў і інш. у гэтым таксама нічога ва ўвесь час не дапамаглі.

У час рэарганізацыі шэфработы меркавалася ўтварыць цэнтральную адзін ку РТСКСГ, якая павінна была кіраваць шэфскай работай па ўсёй Беларусі. Але больш году прайшло з часу гэтага меркаваньня і такой цэнтральнай адзінкі ня чуваць. Гэтую адзінку трэба стварыць.

Р. Казлоў.

Вёска чакае менскіх шэфаў

ЦП саюзу саўгандальслужачых павінна было мабілізаваць вакол пытаньня падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны і далейшага разьвіцьця прыгарадных гаспадарак усю прафсаюзную масу, прыцягваць увагу ўсяго прафактыву. Між тым, на справе саюзу не ўдалося завастрыць увагу членаў саюзу на гэтым важнейшым бо частку работы.

ЦП камандыравала 7 інструктароў і трох працаўнікоў ЦП у 18 раёнаў для правядзеньня практычнай работы, і з намечаных ЦП саюзу 335 рахункоўных працаўнікоў—ужо паслана 220.

Вось што піша брыгадзір Верабейчык з Полацку:

— У Полацкім раёне пытаньне аб вясеньняй пасеўкампаніі абгаворвалася на агульным сходзе членаў саюзу. Усе мясцовы выпрацавалі свае пляны работы па ўдзелу ў пасеўкампаніі. Была заслухана інфармацыя двух падшэфных калгасаў аб стане падрыхтоўкі да вясны. Паслана 7 брыгадзіраў для дапамогі гэтым калгасам па арганізацыі сустрэчных плянаў. Таксама паслана брыгада рахункаводаў з 8 чалавек. У ЦРК створана брыгада з 9 чал. для абсьледваньня стану падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны ў прыгарадных гаспадарках ЦРК.

Цэлы рад калектываў у Полацку арганізавалі сходы і кожны калектыў вылучаў брыгады для дапамогі калгасам і прыгарадным гаспадаркам.

Брыгадзір Бэрэнбург з Бабруйску паведамляе, што калектыў ЦРК праведзе значную работу па падрыхтоўцы да пасеву ў прыгарадных гаспадарках ЦРК. У падшэфнай вёсцы брыгада ЦРК арганізавала новы калгас.

Брыгадзірам з калектыву Стражкасы ўдалося ўцягнуць 9 гаспадарак у калгас «Луч Камуны». Райкіраўніцтва саюзу вылучыла спэцыяльны штаб для кіраўніцтва работай па пасеўкампаніі. Да 10 лютага ўжо пасланы ў калгасы 20 рахункоўных працаўнікоў.

Такое-жа становішча і ў Чэрвені, Шацку, Магілёву і іншых. У **Магілёве** Райсаюзам паслана на вёску 22 ударніка—5 для ачысткі насеньня, правядзеньня рамонту і інш.

Брыгадай ЦРК арганізаваны новы калгас з 12 гаспадарак. Пляны даведзены да саўгасьнікаў сіламі членаў саюзу.

У Менску калектывы сьпяць і амаль ніякай работы не прарабілі калі ня лічыць, што ў некаторых мясцох былі афіцыйныя сходы. Тут ЦП саюзу ня здолела мабілізаваць вакол гэтых пытаньняў грамадзкай думкі. Асабліва дрэнна абстаіць справа ў **Белкаапсаюзе.** Гэты калектыў павінен быў быць заспрэльшчыкам у пасеўнай кампаніі, павінен быў быць паказальным, а між тым, тут нічога не прароблена, брыгады ў падшэфную вёску не пасланы, прыгарадная гаспадаркай мясцком ня цікавіцца. Такое-ж ганебнае зьявішча і ў МЦРК, там «ціха ды гладка».

— Мы заняты выдачай наборных кніжак, і ня можам займацца пакуль пасеўнымі пытаньнямі, вось скончым з кніжкамі...

Такія-жа зьявішчы ў многіх калектывах: у Сампрамсаюзе, Наркамснабе, Наркамфіне Дзяржбанку і інш. ЦП саюзу павінна прыняць самыя рашучыя меры, каб выправіць гэтую справу.

Л. С.

Аграномы ў Глуску не патрэбны

Ёсьць яшчэ і зараз такія раёны, дзе па-ранейшаму лічаць, што аграномы не патрэбны... «Парасьце і так, і бяз іх можна абыйсьціся...». Да такіх раёнаў у першую чаргу трэба аднесьці **Глускі.** Тут заўсёды па 2-3 гады ідзе барацьба з агранамі за нескарыстаны водпуск, за кватэру, за кожную капейку прошай...

У раёне на сёньняшні дзень маецца ўсяго 2 аграномы, а патрэбна па штату—17.

Ня гледзячы на гэта, бюро райкому КП(б)Б на сваім паседжаньні ад 2-IV—1931 г. пастанавіла накіраваць на партработу агранома райкалгасаюзу тав. Дымкова, райагранома тав. Доўбню—на вучастак.

Гэта пастанова вынесена ў той час, калі па калгасах раёну толькі пачыналі складаць рабочыя пляны, калі ідзе змаганьне за зьдзельшчыну ў калгасах, калі ідзе змаганьне за посьпехі сяўбы і калектывізацыі ўсяго раёну.

На гэтай рабоце ў першую чаргу павінны быць накіраваны аграномы. Але ў Глускім раёне зусім не патрэбны аграномы на выкананьне гэтых задач.

Трэба пакласьці канец недацэнцы ролі агранома ў сацыялістычным будаўніцтва. Трэба растлумачыць глускім партыйным і савецкім арганізацыям, што агранамія для сельскай гаспадаркі так патрэбна, як ім лыжка для ежы.

Мірон Гаротнік.

Перамога сусьветна-гістарычнага значэньня

У рэзалюцыі па дакладу аб кантрольных лічбах на 1931 г. сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) даў дырэктыву «ў сярэднім па Саюзе па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі забясьпечыць у 1931 годзе калектывізацыю ня менш палавіны сялянскіх гаспадарак».

На 10 мая ў сярэднім па Саюзе ўжо калектывізавана 50,4 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і, такім чынам, настаўленая сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) задачах, выканана цалкам задоўга да тэрміну. Дырэктыва пленуму выканана ня толькі па ўсім Саюзе ў цэлым, але і па важнейшых раёнах.

Значныя посьпехі калектывізацыі маюць вялізарнейшае значэньне для ўсяго далейшага лёсу сацыялістычнага будаўніцтва.

«Выкананьне пляну ў галіне калектывізацыі дасьць абсалютную перавагу сацыялістычных элементаў над індывідуальным сэктарам вёскі, умацуе замычку рабочай клясы з працоўнымі масамі сялянства і завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР,—гэта будзе перамога сусьветна-гістарычнага значэньня» (з пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Гэтая рашаючая перамога ёсьць на справе. Яна ўжо забясьпечвае завяршэньне сацыяльнай калектывізацыі ўсяго СССР у тэрміны, вызначаныя XVI зьездам партыі, забясьпечвае выраўнэньне сьледам за сярнёвай праблемай іншых важнейшых праблем сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўчай і тэхнічных культур.

50,4 проц. калектывізаваных гаспадарак, гэта—перш за ўсё вынік няўхільна ажыцьцяўляемай партыяй індустрыялізацыі СССР. Уноў пабудаваныя гіганты сельска-гаспадарчага машына-будаўніцтва, выпрацоўваючыя за сотні мільёнаў руб. с.-г. машын новага тыпу, разьлічаных на буйную сацыялістычную гаспадарку, падводзяць новую тэхнічную базу пад сельскую гаспадарку, забясьпечваючы яе далейшае разьвіцьцё, як буйнай «калектыўнай гаспадаркі.

У аснове магутнага руху бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы ляжыць вялізарная палітычная і арганізацыйная работа, якую праводзяць партыя і савецкая ўлада ў вёсцы. Але гэта работа не магла б даць такіх вынікаў, калі-б 6 мільёнаў уступіўшых у калгасы за гэты год аднаасобнікаў на вопыце іншых 6 мільёнаў, ужо правёўшых год у калгасах, не пераканаліся ў вялікіх выгадах і перавагах калгаснай гаспадаркі.

Партыя забясьпечыла новы прыліў у калгасы на аснове поўнай дабраахвотнасьці, ня маючай нічога агульнага як з апартуністычным самацёкам, так і левымі загібамі.

Рашаючай праверкай таго, якімі мэтадамі і на якой аснове праводзілася калектывізацыя, зьяўляецца сяўба. Ня гледзячы на тое, што сяўба ў гэтым годзе па кліматычных умовах пачалася на месяц пазьней, чым у мінулым, калгасамі пасеўны плян ужо выканан на 50 проц., а ў раёнах МТС—на 65 проц. Калгасы, асабліва тыя з іх, якія пасьпелі перайсьці на зьдзельшчыну, (а такіх калгасаў ужо 62 проц.) і правільна арганізаваць працу, дасягнулі сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў сяўбы, ў выніку якіх у пяцідзёнку засеяецца 10-11 мільёнаў га, у той час як у мінулым годзе ў адпаведную пяцідзёнку засявалася 5-6 мільёнаў га.

Аднак, дасягнутыя посьпехі не павінны ні ап'яняць, ні супакойваць. Замацаваньне гэтых посьпехаў вымагае перш-на-перш далейшага ўзмацненьня тэмпаў сяўбы, каб скончыць сяўбу ў тэрмін на працягу, прынамсі бліжэйшых двух-трох пяцідзёнак, мы павінны засяваць па 15-20 мільёнаў га. Такія тэмпы павінны быць забясьпечаны абавязкова. Посьпехі калектывізацыі іх забясьпечваюць. Вопыт перадавых раёнаў і калгасаў, якія ўжо справіліся з сяўбою тыдзень і два тыдні назад, з відавочнасьцю даводзяць, што тэмпы сяўбы могуць быць значна ўзмоцнены.

Замацаваньне і пашырэньне посьпехаў калектывізацыі патрабуюць поўнага пераходу на зьдзельшчыну калгасаў, ліквідацыі маючыхся скажэньняў зьдзельшчыны і арганізацыі такога вучоту працы калгаснікаў, які забясьпечыў-бы сапраўднае разьмеркаваньне даходаў у калгасе ў адпаведнасьці з колькасьцю і якасьцю затрачанай кожным калгаснікам працы.

Замацаваньне дасягнутых посьпехаў павінна быць забясьпечана баявой падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі, ска рачэньнем да мінімуму страт калгаснага ўраджаю.

Нарэшце, замацаваньне дасягнутых посьпехаў патрабуе неаслабнай работы ўсёй партыі, усіх савецкіх органаў, усяго калгаснага актыву па далейшым ўцягненьні аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў у калгасы, рашучай і ўпар барацьбы з кулацтвам. У звароце да аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў, VI зьезд саветаў Саюзу ССР сказаў: «кожны дзень адцягненьня ашага ўступленьня ў калгас замаруджвае рост вашага дабрабыту, пазбаўляе вас магчымасьці зараз-жа скарыстаць усе перавагі буйнай арцельнай гаспадаркі». Гэты зварот павінен быць даведзен да кожнага аднаасобніка. На аснове ўдарнай работы па сяўбе і ўборцы мы павінны дабіцца новых буйных зрухаў у справе сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы.

(З перадавога «Известий»)

Да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў

НА ЗАКЛІК МЕНСКІХ УДАРНІКАЎ „ПРАВДЫ“

бабруйскія рабкоры-ўдарнікі адказваюць канкрэтным абавязацельствам

Шклоўскі райком партыі павярнуўся тварам да рабселькораўскага руху

З перамогамі--на зьезд рабселькораў

БАБРУЙСК 12-5. (Наш кар.). Рабкоры-ўдарнікі Бабруйскіх прадпрыемстваў горача адгукнуліся на заклік Менскіх ударнікаў «Праўды». У апошнія дні гэтую адозву абгаварыў агульнагарадзкі сход рабкораў.

У адказ на адозву Менскіх рабкораў сход паставіў перад сабою баявую задачу ператварыць у сапраўднае жыцьцё лёзунг аб тым, што **«кожны ўдарнік павінен быць рабськорам і кожны рабськор—ударнікам».** Для гэтага рабкоры парашылі разгарнуць самую шырокую вярбоўку ўдарнікаў у друк, праводзячы гэтую работу ў парадку падрыхтоўкі **да Ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду.**

Сход горача падтрымаў прапанову Менскіх ударнікаў аб арганізацыі фонду друку, пастанавіўшы арганізаваць суботнікі ў фонд друку. Асабліваю ўвагу сход надаў пытаньню падрыхтоўкі з рабкораў-ударнікаў новых кадраў для друку праз рабкораўскія семінары.

11 мая адозва Менскіх ударнікаў абгаварылася на агульнагарадзкім сходзе ўдарнікаў заводу **«Чырвоны Харчавік».** На сходзе прысутнічала 77 рабкораў-ударнікаў. Рабкоры - ударнікі ў адказ на адозву выдвінулі шэраг практычных мерапрыемстваў.

У сваёй пастанове яны бяруць на сябе абавязкі: Забясьпечыць рэгулярны выхад насьценгазэт, наладзіць працу насьценнае газэты ў падшэфным калгасе, арганізаваць суботнік у фонд узмацненьня друку, цалкам і поўнасьцю ажыцьцявіць лёзунг: **ніводнага рабкора ня ўдарніка і ніводнага ўдарніка—не рабкора, узяць насьценную газэту завода імя Сталіна на бук сір і наладзіць яе работу.**

Апрача таго рабкоры **«Чырвонага Харчавіка»** паставілі перад сабою задачу ў бліжэйшы час з складу сваіх рабкораў вылучыць 10 рабкораў і падрыхтаваць іх для работы ў нізавым і раённым друку.

У сваю чаргу рэдакцыя раённай газэты ў адказ на адозву Менскіх ударнікаў узяла на сябе абавязкі ўзмацніць працу з рабськорамі, у кожным саўгасе і калгасе стварыць насьценныя газэты, арганізаваць семінары для рабськораў, у адным з саўгасаў кароткатэрміновыя курсы для рэдактароў саўгасных і калгасных насьценгазэт, узмацніць дапамогу насьценгазэтам і шматтыражкам,

Абгаварэньне адозвы ўдарнікаў «Праўды» гор. Менску з кожным днём разгортваецца ўсё шырэй і шырэй па прадпрыемствах Бабруйску. Практычнае правядзеньне прымаемых пастаноў рабкорамі-ўдарнікамі зьявіцца **найлепшаю падрыхтоўкаю да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.**

Рабкоры іншых гарадоў Беларусі павінны па прыкладу Бабруйскіх ударнікаў, адказаць на адозву Менскіх ударнікаў «Праўды» практычным разгортваньнем нізавога друку, практычным ажыцьцяўленьнем лёзунгу: **ніаднаго ўдарніка не рабкора, ніводнага рабкора—ня ўдарніка.**

Бабруйск, Д. Аланскі.

Заплылі апартунізмам

З газэт мы ведаем, што ў шмат раёнах адбылися рабселькораўскія нарады, на якіх рабселькоры атрымалі напрамак для далейшай работы па правядзеньню усіх палітычна-гаспадарчых кампаній і асабліва—ўдзелу рабселькораў і правядзеньні другой бальшавіцкай вясны. Рабселькоры толькі ў тым напрамку могуць справіцца з пастаўленай перад імі задачай, калі з імі будзе весьціся сыстэматычная работа, будзе належнае кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый ,з боку РК КП(б)Б.

Што-ж маюць рабселькоры ў **Коханаўскім раёне?** Як кіруюць імі РК КП(б)Б і партячэйка на вёсцы і нават у цэнтры раёну м. Коханава?

Адказ просты—ніякай работы, ніяка га кіраўніцтва няма, дапамогі атрымаць няма ад каго. У гэтай галіне ў рабоце Коханаўскага раёну панує апартунізм.

Насьценгазэта пры Коханаўскім Нардоме тры месяцы вісіць са старым матар'ялам. Трэба проста сказаць што ў Коханаўскім раёне насьценгазэта заснула як і рэдкалегія яе. Прыклад: заметка **«Лішэнцы ў пашане Каапсаюза»** (і шмат іншых) аддана рэдкалегіі 30-га студзеня г. г. і яшчэ да гэтага часу не надрукавана. Адбіваюць ахвоту пісаць.

— Паважныя таварышы з рэдкалегіі, ну куды-ж гэткая справа варта?.. прасьніцеся, бальшавіцкая вясна на дварэ!

На маю думку—трэба правесьці раённую рабселькораўскую нараду і ўступіць у барацьбу за выкананьне другой бальшавіцкай.

Трэба па сапраўднаму **рыхтавацца да Усебеларускага зьезду рабселькораў.**

Удалы.

Падрыхтоўка да ўсебеларуск га зьезду рабселькораў—пад пагрозай

(Парыцкі раён)

У **Парыцкім** раёне недацэньваюць работы з рабселькорамі. Сходы рабселькораў не праводзяцца. Па ўсім раёне няма ніводнай рабселькораўскай брыгады. Райком партыі ня ведае колькі ў раёне маецца рабселькораў, бо з імі работы ніякай не вядзецца.

У лютым месяцы г. г. РК КП(б)Б у гэтай галіне работы як бы крыху пра будзіўся, але-ж не надоўга і хутка пра гэту работу зноў забыўся.

Па ўсім раёне пранеслася чутка, што з 15 сакавіка выпускаецца раённая газэта, але і да гэтага часу газэты няма. На 4 сакавіка РК КП(б)Б склікаў раёную нараду рабселькораў. Але да гэтай нарады на мясцох не правялі ніякай падрыхтоўкі, у выніку чаго нарада сарвалася. Вынікі Ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху нідзе не абгаварваліся і аб іх ніхто ня ведае. Калі так будзе і надалей—**мы не падрыхтуемся да Ўсесаюзнага зьезду рабселькораў.**

К. Хведарскі.

Зрух будзе

Да апошняга часу ў **Шклоўскім** раёне ніякай работы з рабселькорамі не вялося. Існуючыя насьценгазэты былі апалітычнымі па ўсіх пытаньнях. Райком КП(б)Б і партыйныя ячэйкі бязьдзейнічалі ў галіне работы з рабселькорамі.

Зараз мы маем зрух у галіне кіраўніцтва рабселькорамі. Райком партыі абавязаў усе партыйныя ячэйкі сканцэнтраваць максымум увагі на кіраўніцтве рабселькорамі. Перавыбары бюро вясковых партячэйк былі ўвязаны з пытаньнем рабселькораўскага руху.

— Усе партыйныя ячэйкі павінны сыстэматычна заслухоўваць справаздачы рэдкалегій насьценгазэт аб іх рабоце. — Такую дырэктыву даў райком партыі.

У раёне зацьверджан адзін дзень у месяц —дзень рабселькораўскай работы. Раённая газэта **«Прамень камунізму»** пачала ўжо вучот рабселькораў, хутка будзе склікана нарада.

М. Гарскі.

Абсьледваньне Віцебскай партарганізацыі

У Віцебск прыбыла брыгада ЦК і ЦКК КП(б)Б, якая занялася абсьледваньнем становішча партарганізацыі. Пастановай бюро гаркому партыі аб'яўлен двухдзённік па праверцы работы партарганізацыі, як Віцебская парт арганізацыя змагалася за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, як яна перабудавала сваю працу, выходзячы з рашэньняў XVI партыйнага зьезду і як яна разгортвала самакрытыку і ці стала самакрытыка штодзённым мэтадам барацьбы за выкананьне прамфінпляну, калектывізацыі і г. д. Створаны ўдарныя брыгады з лепшых рабочых ударнікаў, партыйцаў, рабкораў, якія дапамагаюць брыгадзе ЦК і ЦКК у рабоце па абсьледваньні партарганізацыі. Праводзіцца таксама і абсьледваньне работы гарсавету.

Энтузіясты пяцігодкі

У барацьбу за ўтрыманьне ўзятых тэмпаў былі закліканы ўдарнікі 4-х цэхаў скурзаводу «Бальшавік». Хто лепш выканае прамфінплян па ўсіх паказьніках, хто дасьць лепшыя прапановы, ажыцьцявіць поўнасьцю ўсе задачы, якія стаяць перад рабочай клясай,—той возьме пераходны сьцяг заводу.

Такія ўмовы міжцэхавага конкурсу, абвешчанага ў пачатку студзеня на «Бальшавіку».

Студзень. У першым хромавым цэху прарыў у зьніжэньні сабекошту і сорт насьці. Ударажэньне продукцыі, брак. Хмура глядзяць на разьвешаныя зводкі аб выкананьні прамфінпляну рабочыя і майстры цэху.

— Не да конкурса, браток. Як бы наогул ня сесьці.

— Таварышы ,мы заявялі пераходзячы сьцяг на Ўсебеларускім конкурсе, няўжо-ж, таварышы, нам да твару рабіць брак, падвышаць кошт?..— гаворыць на групавой нарадзе ударных брыгад заг. цэхам тав. Ліўшыц.

— Зойдзеш у сушку—сэрца баліць тавар вісіць не плаціраваны, скручаны.

— Слабыя абучыны ня трэба рэйкаваць: дзярэцца. Трэба расьцягваць рукамі на белякох.

— Галоўнае—гэта сапраўднае ўдарніцтва і спаборніцтва—гавораць таварышы Каган, Баданес, Ракаўшчык, Левін.

Кожны ўдарнік мае кніжку—памятку, у якой адзначае сваю выпрацоўку, у якасьць, колькасьць браку, удзел у якасьць, колькасьць браку, удзел у грамадзкім жыцьці (наведваньне нарад, сходаў, вучоба). Пасьля кожнай дэкады «трыкутнік» брыгады правядзе запіс ў памятцы, падпісвае іх.

Прарыў у першым хромавым цэху быў выяўлены сваячасова. Майстары цэху ўзялі на сябе абавязацельства весьці дакладны і штодзённы вучот выхаду тавару. І ледзь толькі выяўляецца шчыліна ў прамфінпляну, увесь калектыў цэху ўзядзе рашучую барацьбу за тое, каб дагнаць упушчанае, за зараз-жа выправіць гэтую памылку і па-баявому ўзяцца за ліквідацыю прарыву на фронце загатоўкі лёну.

Насьценгазэта цэху **«Ленінскі Шлях»**—газэта Слуцкага раёну — не вядзе ніякай барацьбы за выкананьне лёназагатоўчай праграмы. Гэта можна сказаць з усёй шчырасьцю.

З 15 сакавіка да 1 мая мы ў газэце знаходзім толькі дзьве «бяззубыя» заметкі. На гэтым «Ленінскі Шлях» скончыў сваю барацьбу за лён.

Калі нават Слуцкі раён таксама не выяўляецца пераважна лёнаводным раёнам, дык гэта зноў такі не аслабляе яго ад выкананьня пляну лёназагатовак.

«Ленінскі Шлях», які фактычна замоўчвае аб прарыве на лёназагатоўчым фронце, гэтым самым садзейнічае паглыбленьню гэтага прарыву.

* * *

Вялікае значэньне загатовак лёну заключаецца па-першае ў тым, што вырашэньне праблемы тэхнічных культур займае зараз у нашай прамысловасьці рашаючае значэньне.

Тав. Сталін на XVI партзьезьдзе гаварыў:

«Пры вырашэньні праблемы гэтых культур нам трэба рухацца тым-жа шляхам, якім ішлі мы ў галіне вырашэньня зернавой праблемы.

«Зараз, калі ўжо разьвязалі ў асноўным зернавую праблему, мы можам прыступіць да адначасовага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі, якая зьяўляецца ў даны момант вельмі важнай праблемай, і праблемы тэхнічных культур».

Тэкстыльная прамысловасьць патрабуе сыравіну, патрабуе лён. Прарыў на лёназагатоўчым фронце, гэта тойжа прарыў у тэкстыльнай прамысловасьці.

Перад раённым друкам паўстае задача скарыстаць друк, як лепшую зброю для выкананьня задач, пастаўленых перад краінай партыяй і ўрадам. Друк павінен сканцэнтраваць на слабым вучастку лёнавага фронту максымум агню, стаць сапраўдным арганізатарам мас і змагаром за 100-процантнае выкананьне лёназагатовак у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Лёнінскі Шлях

Раённая газэта. Орган Слуцкага РК КП(б)Б і РВК

«Ленінскі Шлях»—газэта Слуцкага раёну — не вядзе ніякай барацьбы за выкананьне лёназагатоўчай праграмы. Гэта можна сказаць з усёй шчырасьцю.

З 15 сакавіка да 1 мая мы ў газэце знаходзім толькі дзьве «бяззубыя» заметкі. На гэтым «Ленінскі Шлях» скончыў сваю барацьбу за лён.

Калі нават Слуцкі раён таксама не выяўляецца пераважна лёнаводным раёнам, дык гэта зноў такі не аслабляе яго ад выкананьня пляну лёназагатовак.

«Ленінскі Шлях», які фактычна замоўчвае аб прарыве на лёназагатоўчым фронце, гэтым самым садзейнічае паглыбленьню гэтага прарыву.

* * *

Вялікае значэньне загатовак лёну заключаецца па-першае ў тым, што вырашэньне праблемы тэхнічных культур займае зараз у нашай прамысловасьці рашаючае значэньне.

Тав. Сталін на XVI партзьезьдзе гаварыў:

«Пры вырашэньні праблемы гэтых культур нам трэба рухацца тым-жа шляхам, якім ішлі мы ў галіне вырашэньня зернавой праблемы.

«Зараз, калі ўжо разьвязалі ў асноўным зернавую праблему, мы можам прыступіць да адначасовага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі, якая зьяўляецца ў даны момант вельмі важнай праблемай, і праблемы тэхнічных культур».

Тэкстыльная прамысловасьць патрабуе сыравіну, патрабуе лён. Прарыў на лёназагатоўчым фронце, гэта тойжа прарыў у тэкстыльнай прамысловасьці.

Перад раённым друкам паўстае задача скарыстаць друк, як лепшую зброю для выкананьня задач, пастаўленых перад краінай партыяй і ўрадам. Друк павінен сканцэнтраваць на слабым вучастку лёнавага фронту максымум агню, стаць сапраўдным арганізатарам мас і змагаром за 100-процантнае выкананьне лёназагатовак у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

М. Нэлін.

РВК зрывае пабудову сталоўкі

Слуцак. (Наш карэспандэнт). Калгас «Батрак», у сувязі з тым, што ў яго маецца шмат батракоў, парашыў арганізаваць грамадзкае харчаваньне, пабудаваць сталоўку і кухню. Для гэтай мэты не хапае 500 штук цэглы. Старшыня Праўленьня некалькі раз зьвяртаўся ў РВК з просьбай адпусьціць неабходную колькасьць. Але... ніхто не зьвяртае ўвагі. Пасылаюць да плянавіка, а плянавіка ніколі няма. Такім чынам, дзякуючы затрымцы ў пабудове сталоўкі, зрываецца і пасьпяховае выкананьне работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Неабходна зьнішчыць такія адносіны, трэба дапамагчы калгасу наладзіць грамадзкае харчаваньне.

А. Курдо.

Агляд друку

У бой-за лён!

Друк нясе на сабе адказнасьць за выкананьне пляну лёназагатовак разам з усімі тымі арганізацыямі, якія непасрэдна праводзяць гэту работу.

Задача друку заключаецца ў тым, каб з ўсёй палітычнай вастратой біць па апартуністычнай стаўцы на самацёк, на прарывах, выяўляць канкрэтных носьбітаў гэтых прарываў, быць арганізатарамі мас і памоцнікам партыі і ўраду ў справе хутчэйшага выкананьня лёназагатоўчых пляноў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у справе мабілізацыі мас вакол выкананьня і перавыкананьня лёназагатоўчай праграмы.

Тым больш задачы друку набываюць вялікае значэньне на умовах БССР—краіны, якая ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі павінна дасягнуць сацыялістычнай прамысловасьці 24.000 тон лёну.

Указаньні ЦО «Правда» і ЦК КП(б)Б зьявіліся штуршком для нашае газэты якая зрабіла пералом ў сваёй рабоце па мабілізацыі мас вакол загатовак і кантрактацыі лёну—(арганізаваны два рабкораўскіх рэйды па праверцы лёназагатовак, рашуча пастаўлены пытаньні аб паскораньні будаўніцтва 45 лёназаводаў у БССР (дадзена 5 падбораК), амаль штодзённа асьвятляецца ў газэце ход загатовак і кантрактацыі лёну (за паўтара месяцы дадзена 22 падборкі), рэдакцыя ўключылася ва Ўсесаюзную ільняную пераклічку. Але гэта рэдакцыя лічыць яшчэ недастатковым. Трэба яшчэ больш узмоцніць апэрацыйнасьць і арганізатарскую ролю газэты ў рабоце па загатоўках і кантрактацыі лёну па БССР.

* * *

Як жа некаторыя раённыя газэты праводзяць барацьбу за лён, як яны змагаюцца за выкананьне пляну загатоўкі лёну гэтага году?

Аб доглядзе пасеваў, папарнай і ўборачнай кампаніі

Усім калгассаюзам і праўленьням калгасаў

У мэтах забесьпячэньня пасьпяховага выкананьня ўборкі ўраджаю ў калгасах у 1931 годзе, праўленьне Белкалгасцэнтру прапануе:

Догляд пасеваў

Калгассаюзам і калгасам правесьці:

1. Трохразовае поліва гародаў.
2. Двухразовае поліва кораньплодаў насеньнікаў лугавых траў.
3. Трохразовую прапашку кораньплодаў і двухразовую асыпку бульбы.
4. Двухразовае прарэджваньне кораньплодаў. Першае прарэджваньне зрабіць з паўленьнем двух лісткоў з працягам ня больш 5-7 дзён.
5. Пры стварэньні ў часе ўсходу па пасевах ільну кары, абавязкова правесьці баранаваньне атылкам бараны ці пракатваньне кальчатым каткам.
6. На працягу лета абавязкова правесьці ня менш аднаго разу поліва на ўсёй плошчы пасеву ільну, робячы гэта ў часе даўжыні калёва 10-18 сантыметраў (2-4 вяршкі) і пры сярэдняй вільготнасьці глебы.

Падрыхтоўка папару

Правесьці першае ворыва чыстага папару не пазьней 15 чэрвеня і правесьці двух-трохразовае баранаваньне папару ў залежнасьці ад засьмечанасьці пустазельлем.

Выканаць пры ворыве папару поўнасьцю заданьне на вапнаваньні пад азімыя.

Стварэньне кармовай базы

Выканаць поўнасьцю заданьне па пабяхоўным палянпшэньні сенажаці: зьнішчэньне хмызьнякоў, куп'я, пустазельля, баранаваньне залёўных і займшэлых сенажацяй, расчыстка канаў і спуск вады. Устанавіць у кожным раёне і калгасе пэўныя тэрміны—пачатак і канец работы па скопваньні сенажаці і траў. Каб забясьпечыць поўную і добраякасную ўборку траў і сенажацяй і дабіцца зьняцьця двух ураджаяў з сенажацяй і атрыманьня добраякаснага корму, уборку сенажацяй праводзіць у пэрыяд красаваньня. Уборку натуральных сенажацяй правесьці на працягу 15-20 дзён, а сеяных траў—10 дзён. Наяўныя сенакасілкі поўнасьцю нагрузіць работай. Мінімальная нагрузка на адну косную сенакасілку ў дзень—6 гэктараў. Устанавіць цьвёрдыя каляндарныя пляны ўборкі сенажаці і траў і арганізаваць дапамогу касілкамі адных калгасаў другім з тым, каб касілкі ўвесь час уборкі былі поўнасьцю нагружаны. Стварыць спэцыяльныя брыгады па ўборцы сенажаці і траў.

Выканаць поўнасьцю заданьне па рамонце старых і пабудове новых сіласных вежаў, траншэй і ям не пазьней 1 ліпеня. Засіласаваць вызначаную па пляне сілосную масу не пазьней 15 кастрычніка. Калгасцэнтр БССР звярачае ўвагу калгассаюзаў і калгасаў, што плянавыя заданьні па сіласаваньні зьяўляюцца мінімальнымі, таму ў мэтах павялічэньня кармовых запасаў ужыць усе захады да перавыкананьня заданьняў. Не пазьней 1 чэрвеня вылучыць у кожным калгасе члена праўленьня, які адказвае за сваячасовае і поўнае выкананьне праграмы ўборкі сена, траў і сіласаваньня і забесьпячэньня жывёлы кармамі на ўвесь час стойлавага і пашанага пэрыяду. Абавязаць калгассаюзы і калгасы звыш кармовых фондаў стварыць недатыкальныя запасы грубых кармоў ня менш 15 проц. гадавой патрэбы. Канкрэтныя пляны патрэбнасьці кармоў па кожным калгасе і брані яваных фондаў павінны быць складзены ва ўсіх калгасах да 15 чэрвеня.

Арганізацыя ўборкі ўраджаю

Абавязаць калгассаюзы і калгасы ўборку ўраджаю правесьці ў максымальна кароткі тэрмін. Устанавіць наступны працяг уборкі розных культур у калгасах:

азімая 10 дзён,
яравыя збожжавыя 15—20 дзён,
церабеньне ільну 15 дзён,
расьсьціл, сушка і пад'ём ільну 15 дзён,
уборка гародніны 20 дзён,
уборка бульбы і кораньплодаў 25 дзён,
абмалот азімых для насеньня да 15-VIII.

Для поўнага скарыстаньня машын устанавіць наступную працяжнасьць працы і нагрузку:

	У МТС і калгасах гадз. у суткі ў сярэднім	Нагрузка на 1 машыну ў суткі ў сярэднім
Трактар „Інтэрнацыянал" араць	21 гадз.	6 гэкт.
Трактар „Фордзон-пуцілавец"	21 „	5 „
Стацыянарныя рухавікі і трактары на малацьбе	21 „	— „
Сенакасілкі трактарныя	16 „	10 „
Жняркі і снапавязалкі трактарныя	12 „	9 „
Жняркі і снапавязалкі конныя	12 „	6 „
Ільнацерабілкі трактарныя	13 „	3 „
Ільнацерабілкі конныя	13 „	1,6 „
Трактарныя бульбакапалкі	12 „	2 „
Конныя бульбакапалкі	12 „	1,3 „

Абавязаць калгассаюзы і калгасы на падставе норм выпрацоўкі Калгасцэнтру і вопыту лепшых калгасаў па ўсіх відах работы па догляде пасеваў і ўборцы ўраджаю ўстанавіць нормы выпрацоўкі, якія і палажыць у аснову пры складаньні рабочых плянаў у калгасах і раённых плянаў уборачнай кампаніі, улічваючы пры гэтым, што нормы выпрацоўкі Калгасцэнтру зьяўляюцца мінімальнымі. Пры складаньні раённых плянаў уборкі і рабочых плянаў у калгасах устанавіць цьвёрдыя каляндарныя пляны пачатку і канца работ. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на парадак і час правядзеньня работ. Улічыць супаданьне паасобных работ, выявіць напружаныя пэрыяды і адпаведна гэтаму вызначыць такі парадак арганізацыі работ, расстаноўку рабочай і цягавай сілы, якія-б цалкам забясьпечылі сваячасовае выкананьне работ.

Уборка збожжавых і траў

Пры ўборцы збожжавых і траў, як правіла, ўстанавіць:

1. Ні ў якім разе не чакаць, пакуль збожжа пасьпее на ўсіх палёх калгасу.
2. Бесьперапынна праварваць сьпеласьць збожжа на асобных палёх калгасу.
3. Ні ў якім разе не дапускаць перасьпеласьці збожжа і траў, а арганізаваць уборку па меры насьпяваньня. Канюшына, другі ўкос якое пакідаецца на насеньне, першы ўкос убіраецца да пачатку красаваньня.
4. Раней убіраць збожжа, якое лёгка асыпаецца, а потым з моцна сядзячым зернам у колгасе.
5. У мэтах зьмяншэньня страт раней пракасіць праходы для снопавязак і жнявярак, акасіць вуглы, каб не затрымаць машыны для ўборкі і не таптаць збожжа.
6. Не дапускаць, каб скошанае збожжа заставалася на палёх у валках, ня зьвязаным, а ў снапох—ня складзеным у копы або ў сьцірты больш 2-х дзён.
7. Пры напрузцы збожжа на вазы і разгрузцы снапоў скідаць асьцярожна і гэтым самым не дапускаць асыпаньня зярнят.

Уборка ільну

1. Церабленьне (выбарка ільну) праводзіць толькі ў часе жоўтай сьпелась ці, калі галоўкі пачнуць жаўцець і 1-3 лісткі зьнізу асыпаюцца.
2. У мачанцовых раёнах праз 1-2 дні пасьля церабленьня абразаць галоўкі і салому замачыць у капанцы (мачылы), а ў раёнах сланцовых выцераблены лён добра прасушыць на полі ў шатрох (козлах) да канчатковай сьпеласьці насеньня і, зьвёзшы яго ў закрытае памяшканьне, абчасаць ці абмалаціць галоўкі і разаслаць.
3. У тых раёнах, дзе ільназаводы будуць весьці пераапрацоўку ільнасаломы пасьля абмалоту галовак неадкладна салому накіраваць заводу, а пры немагчымасьці зрабіць гэта адразу, зложыць яе ў закрытых ад дажджу і сьнегу памяшканьнях, пры адсутнасьці-ж іх—у стагі, згодна спэцыяльнай інструкцыі па кладцы саломы ільну.
4. Расьціл саломы ільну правесьці не пазьней 20 верасьня з тым, каб расту падняць са сьцелішча не пазьней 1 лістапада.
5. Месцы для расьцілу выбіраць роўныя і па магчымасьці плошчы сенажацяй.
6. Гушчыню расьцілу рабіць з разьліку з аднаго гэктара саломы па 1¼ гэкт. сьцелішча ў сярэднім.
7. За разасланай саломай ільну ўста навіць суровы нагляд, каб яна не перажлела на сьцелішчы, ужыць абавязкова наступнае:, пасьля двух тыдняў выславаню салому перавярнуць на другі бок і ў залежнасьці ад надвор'я пачынаючы з чацьвёртага тыдню ад часу расьцілу, браць пробы трасты прыкладна праз кожныя 7 дзён. Пробы трэба браць у розных мясцох сьцелішча, невялікімі пучкамі, вагой каля аднаго кілё. Узятую пробу трэба прасушыць і зьмяць і, калі кастрыца ад валакна будзе лёгка аддзяляцца, дык лён неадкладна трэба падняць са сьцелішча, прасушыць яго ў бабках і зьвесьці ў закрытае ад дажджу і сьнегу памяшканьне з наступнай перапрацоўкай трасты на месцы або здачай яе бліжэйшаму ільназаводу.
8. Стварыць асобныя брыгады па доглядзе і ўборцы ільну з тым, каб да пачатку кожнага пэрыяду работы даць ім цьвёрдае заданьне, каб яны былі дэтальна прапрацаваны на кожнай брыгадзе і ўстаноўлен разьмер работы для кожнага калгасьніка.

Для выкананьня работ па ільне ў максымальнай меры выкарыстаць працу жанчын. Для павышэньня зацікаўленасьці калгасьнікаў і калгасьніц у лепшай арганізацыі і правядзеньні работы па ільнаводзтве, вылучыць спэцыяльныя прэміяльныя фонды ў калгасах.

Уборка бульбы і кораньплодаў

Абавязкова праводзіць перавораньне бульбы для таго, каб уся бульба была поўнасьцю выбрана з зямлі. Пры ўборцы бульбы і кораньплодаў асаблівую ўвагу зьвярнуць на уважлівую ачыстку бульбы і кораньплодаў ад бацьвіньня і зямлі, арганізаваць адсартаваньне бульбы пры яе захаваньні. Ссыпку бульбы і кораньплодаў у капцы і скляпы рабіць у сухім выгляде, добра прыкрываючы капцы (саломай, лісьцем і зямлёю).

Вызначэньне насенных пасеваў і малацьба збожжавых

Для стварэньня насеннага фонду ў калгасах на восень 1931 г. і вясну 1932 г. і забесьпячэньне пашырэньня пасеваў гародніх, кармовых і тэхнічных культур:

1. Выявіць сартовыя і палепшаныя пасевы збожжавых і тэхнічных культур і даць да 1 чэрвеня заяўкі кантрольна-насенным станцыям на правядзеньне апрабацыі.
2. Вылучыць вучасткі сартовых і палепшаных пасеваў збожжавых і тэхнічных культур, правесьці асобны абмалот гэтых пасеваў, ссыпаць насеньня фонды для патрэб калгасу і лішкі забраняваць для стварэньня раённага насеннага фонду.
3. Лубін, лугавыя травы, азімую вікі і беспакроўныя пасевы сэрадэлі па ўсіх калгасах поўнасьцю пакінуць на насеньне. Насеньне азімай вікі поўнасьцю скарыстаць для азімай сяўбы 1931 году.
4. Палепшаныя (аднатыпныя) пасевы яравой вікі поўнасьцю пакінуць на насеньне. Ад звычайных пасеваў вікі пакінуць на насеньне ня менш 20 проц. агульнай плошчы.
5. З першага ўкосу чырвонай канюшыны пакінуць на насеньне ня менш 20 проц. ад усёй плошчы. Звыш таго ў паўднёвых і сярэдніх раёнах (там, дзе высьпявае канюшына другога ўкосу) пакінуць на насеньне канюшыну другога ўкосу ня менш 25 проц., а ў насенаводчых калгасах пакінуць усю плошчу (сыпіс раёнаў асобна дасылаецца).
6. Насенаводчыя калгасы павінны поўнасьцю выканаць заданьне па пакіданьні на насеньне кармовых кораньплодаў і кармовых культур. У іншых калгасах пры ўборцы адабраць з фуражных і спажывецкіх пасеваў высадкі ў колькасьці патрэбнай для забесьпячэньня раённаў насеньнем. Калгасаюзам да 1 чэрвеня праверыць фактычна засеяную плошчу сартовых і палепшаных пасеваў у калгасах.

Малацьба збожжавых павінна праводзіцца непасрэдна за ўборкай. Азімыя, вызначаныя для пасеву, і ўсё гатунковае жыта абмалочваецца ў першую чаргу. Падрыхтаваць гумны і такі для складаньня снапоў у сьцірты, ачысьціўшы і зрабіўшы належны подсьціл для сьціртаў. Адначасова з малацьбою праводзіцца ачыстка і сартаваньне збожжа. Пры малацьбе і ачыстцы неабходна сачыць за тым, каб не рабілася зьмешваньня яравых і азімых культур і гатунковых са звычайнымі. Прывесьці ў парадак збожжахавальнікі, зрабіць загадзя іх дэзынфэкцыю. Правесьці пробны абмалот, пасьля чаго інфармаваць усіх калгасьнікаў аб сярэднім ураджаі з гектара, а таксама аб мяркуемым зборы збожжа ва ўсёй гаспадарцы. Да 20 жніўня РКС павінен мець весткі пробных абмалотаў збожжавых. На кожным таку пры абмалоце ў склад брыгады павінны быць вылучаны адказныя прыёмшчыкі абмалочанага збожжа, на абавязкі якіх укладаецца дакладны ўлік абмалочанага збожжа па гатунках. Аб колькасьці абмалочанага збожжа кожны дзень даюцца весткі ў праўленьне калгасу. Мякіна, салома і інш. адкіды старанна ўбіраюцца і складаюцца ў часе малацьбы. Па сканчэньні абмалоту на праўленьні і сходзе калгасьнікаў выслухаць вынікі абмалоту.

Транспарт і інвэнтар

Абавязаць калгассаюзы разьмеркаваньне ўборачных машын і па апрацоўцы прапашных культур строга ўвязаць з магчымасьцю поўнага выкарыстаньня апошніх і наяўнасьцю працоўнай сілы ў калгасах, забясьпечыўшы ў першую чаргу тыя калгасы, дзе адчуваецца недахват працоўнай сілы. Да 1 чэрвеня калгассаюзам разьмеркаваць паміж калгасамі ўсе ўборачныя, прапоначныя машыны і транспартны інвэнтар (калёсы і збрую). Абавязаць калгасы забраць вызначаны ім інвэнтар са складу не пазьней 10 чэрвеня. Не разьмеркаваныя і нявыкупленыя са складу ўборачныя машыны і калёсы да вызначанага тэрміну будуць перакінуты ў іншыя раёны. Абавязаць праўленьні калгасаў адрамантаваць да 10 чэрвеня гужавы транспарт (калёсы і збрую) і с. г. інвэнтар, загатовіць патрэбную колькасьць вяровак і пастронкаў, скарыстоўваючы ўнутраныя рэсурсы калгасаў і паасобных калгасьнікаў. Вывіць увесь с.-г. інвэнтар, патрабуючы рамонту і неадкладна пачаць рамонт. Калгасы, якія ня маюць сваіх кузьняў, павінны дагаварыцца з калгассаюзамі аб месцы і тэрміне рамонту іх інвэнтару. Праўленьням калгасаў устанавіць патрэбнасьць у рамонтных матар'ялах і запасных частках, маючы на ўвазе максымальнае выкарыстаньне ўнутраных рэсурсаў. Кузьні калгасаў перавесьці на трохзьменную работу. Вылучыць у кожным калгасе асобу, адказную за добраякаснае і сваячасовае сканчэньне рамонту інвэнтару.

Арганізацыя працы ў часе ўборкі

Уборачную кампанію праводзіць на асноўе шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва як паміж калгасамі, так і ўнутры калгасаў паміж брыгадамі, групамі і калгасьнікамі, а таксама паміж калгасамі і саўгасамі. арганізаваўшы ўдарныя брыгады і г. д. Асноўнымі ўмовамі для сацспаборніцтва могуць зьяўляцца: а) правільны і сваячасовы догляд пасеваў; б) хуткасьць уборкі; в) якасьць уборкі; г) хуткасьць і якасьць малацьбы і г. д. Перад пачаткам работ абавязкова робіцца праверка гатоўнасьці калгасу да ўборкі і малацьбы. Брыгадзірам правяраецца гатоўнасьць сваёй брыгады, праўленьнем—гатоўнасьць усіх брыгад. Усе работы па доглядзе пасеваў, уборцы збожжавых і тэхнічных, прапашных, траў і сена, павінны быць арганізаваны зьдзельна з ацэнкай у працаднёх. У мэтах устанаўленьня адказнасьці за якасьць работы, якая выконваецца, і павышэньня ўраджайнасьці ўстанавіць, як цьвёрдае правіла, брыгадзір і асноўная маса калгасьнікаў брыгады апрацоўваюць або ўбіраюць замацаваныя за брыгадай вучасткі, пачынаючы ад пасеву або праполкі і да канца ўборкі, брыгада, як правіла, не распускаецца, а павялічваецца або па мяншаецца ў залежнасьці ад патрэб ў тэй ці іншай рабоце. Брыгадзіры і брыгада нясуць адказнасьць за сваячасовую апрацоўку, якасьць апрацоўкі і страты пры ўборцы ўраджаю. Парадак уборкі і патрэбную колькасьць работ праўленьне калгасу абавязана даць брыгадзірам да пачатку работ. Замацаваны вучастак за брыгадай у выпадку патрэбы разьбіваецца паміж групамі калгасьнікаў брыгады. Групы калгасьнікаў расстанаўляюцца на работу такім чынам, каб пры зьдзельнай працы была магчымасьць улічыць колькасьць праведзенай працы кожным калгасьнікам і ацаніць яе ў працаднёх. Тэрміны, устаноўленыя праўленьнем і абгаворваныя і зацьверджаныя агульным сходам для правядзеньня работ, абавязковы для калгасьнікаў. Калі работы па ўборцы ўраджаю зацягваюцца з-за нявыхаду на работу і дрэннай працоўнай дысцыпліны, праўленьне калгасу абавязана прыцягнуць на работу для ліквідацыі прарываў ударныя брыгады калгасьнікаў, ужо выканаўшыя сваё заданьне, прэміюючы іх павышэньнем ацэнак у працаднёх на 10-25 проц. і паніжаць на 10-25 проц. працадні, якія прылічваюцца калгасьнікам, што зрываюць работу па доглядзе пасеваў і ўборцы. Па сканчэньні работы праўленьне калгасу робіць прыёмку работ ад брыгады. Кожны калгасьнік абавязан выканаць даручаную сяму работу добраякасна. Брыгадзіры-групаводы абавязаны сачыць за якасьцю праведзенай работы, калгасьнікі па патрабаваньні брыгадзіра абавязаны паправіць дрэнную работу. У выпадку неабходнасьці брыгадзір можа панізіць ацэнку ў працаднёх групам за дрэннае выкананьне работы і паставіць на выкананьне работы лепшыя групы з павышэньнем ім ацэнкі за кошт дрэннай групы ад 10 да 25 проц. Пры дрэннай якасьці работы і невыкананьні норм выпрацоўкі брыгадзір ставіць пытаньне аб спагнаньні ў адносінах такіх калгасьнікаў і груп на абгаварэньне брыгады і паведамляе праўленьню калгасу.

У мэтах сваячасовай апрацоўкі і ўборкі ўраджаю для кожнай калгаснай сям'і ўстанаўляецца мінімальная колькасьць працадзён, абавязковая для выканаўня ў пэрыяд догляду пасеваў і ўборкі ўраджаю. У мэтах найбольш поўнага выкарыстаньня працы жанчын-калгасьніц і ўцягненьня іх у калгасную вытворчасьць, асабліва жанчын з малымі дзецьмі, кожны калгас павінен арганізаваць догляд дзяцей шляхам стварэньня пастаянных або сэзонных ясляй, або прасьцейшы догляд дзяцей непасрэдна на мясцох правядзеньня работ. Абавязаць калгассаюзы і калгасы да 1 чэрвеня скласьці балянс рабочай і цягавай сілы на час уборкі ўраджаю, улічваючы пры гэтым мінімальныя патрэбы рабочай і цягавай сілы ў іншых галінах гаспадаркі. На падставе балянсу ўстанавіць лішак і недахват рабочай і цягавай сілы ў часе ўборкі і намеціць узаемную дапамогу людзьмі і машынамі аднаго калгасу другому. Рабочы плян у калгасах па ўборцы ўраджаю абвязкова павінен быць складзен, прапрацаван на вытворчай нарадзе і па брыгадах і даведзен да кожнага калгасьніка не пазьней як за тыдзень да пачатку ўборкі.

Кадры

У мэтах падрыхтоўкі калгасьнікаў для работы на складаных уборачных і малатарных машынах, арганізаваць у кожным раёне ў чэрвені месяцы 10-дзённыя курсы. Колькасьць курсантаў устанавіць па колькасьці машын, аднак, ня менш як па адным калгасьніку з кожнага калгасу. Арганізаваць таксама 10-дзённыя курсы брыгадзіраў уборачных брыгад па 3-4 чал. з кожнага калгасу, у залежнасьці ад разьмераў апошняга. У раёнах МТС арганізацыю курсаў ускласьці на дырэктароў МТС, а ў іншых раёнах—на калгассаюзы. Абавязаць калгассаюзы і дырэктароў МТС забясьпечыць курсы выкладчыкамі і адпаведнымі с. г. машынамі для правядзеньня практычных заняткаў і забясьпечыць поўнае ўкамплектаваньне курсаў калгасьнікамі.

Ахова ад агню

Каб унікнуць пажару ад неасьцярожнага абыходжаньня з агнём, і таксама ад падпалаў клясавага ворага, праўленьні калгасаў абавязаны адрамантаваць пажарны абоз, а там дзе яго няма, супольна з сельсаветам арганізаваць, прапрацаваць разам з сельсаветам проціпажарныя мерапрыемствы, вылучыць дзяжурных людзей для назіраньня і аховы. Забараніць курэньне на таку і на пэўнай адлегласьці раскладаць агонь; ужываць меры спагнаньня за парушэньне проціпажарных мер. Мець на такох пастаянны запас вады. У мясцох вялікага скапленьня збожжа ўстанавіць пастаянныя дзяжурствы проціпажарнай аховы, умовіўшыся аб гэтым з сельсаветам. Праўленьне калгасу павінна ўжыць крокі да стварэньня пажарных дружын з калгасьнікаў. Арганізацыя і назіраньне за правядзеньнем у жыцьцё проціпажарных мерапрыемстваў ускладаецца асабіста на старшыню калгасу або на спэцыяльна вылучанага члена праўленьня.

Летаняя ўборачная кампанія мелася сур'ёзьнейшых недахопаў у рабоце як паасобных калгасаў, так і калгасных аб'яднаньняў. Надыходзячая ўборачная кампанія разгортваецца пры наяўнасьці ўжо набытага вопыту. Таму павінны быць павышаны патрабаваньні большай арганізаванасьці, выразнасьці работы і адказнасьці за выкананьнем задач, якія ўскладаюцца як у адносінах да ўсіх калгасаў, груп калгасьнікаў, кожнага калгасьніка, так і калгасных аб'яднаньняў. Усе калгасьнікі павінны выразна ўяўляць выключную важнасьць надыходзячай уборачнай кампаніі ў справе ўзмацненьня калгаснага руху і не забываць аб тым, што клясавы ворагкулак імкнецца прарваць паасобныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва. Дружнай арганізаванай працай калгасьнікаў, умелай садзейнасьцю і кіраўніцтвам з боку калгасных арганізацый, лепшым правядзеньнем уборачнай кампаніі замацуем калгасы і дамо рашучы адпор клясаваму ворагу—кулацтву.

Старшыня Калгасцэнтру МІЦЬКОЎ.
13-V-31 г.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Ачысьціць калгас ад кулакоў і антысэмітаў

З прычыны недастатковага кіраўніцтва калгасным рухам з боку Смалянскай ячэйкі КП(б)Б і сельсавету на па саду старшыні праўленьня калгасу «Камунар» пралез былы юнкер белагвардзеец Жылінскі, які праз сваіх наймітаў праводзіў падрыўную, шкодніцкую і разлагаючую работу ў калгасе.

Жылінскі праявіў сябе як махровы антысэміт. Ён зьдзекваўся з сям'і калгасьніка яўрэя Хаюціна. Жылінскі пры мушаў Хаюціна выйсьці з калгасу, бо ён нібыта ня зможа справіцца з работаю, між тым як Хаюцін зьяўляўся, па водзывах калгасьнікаў, старанным работнікам. Калі-ж сям'я Хаюціна не паслухала гэтых наговораў і з калгасу ня выйшла, то Жылінскі і член праўленьня Швэдка парашылі выжыць Хаюціна іншым спосабам. Яны не давалі Хаюціну прадуктаў, не давалі каня для работы і прымушалі ісьці да індывідуальніка пазычаць вупраж за асобную плату, у той час, як калгасныя коні і вупраж былі не заняты. Жонка падкулачніка Швэдкі аднойчы абліла вадою Хаюціна за тое, што апошні прыйшоў да Швэдкі па калгасны хамут. У той час, калі ў калгасе згніло каля 16 тон саломы, Жылінскі на просьбу Хаюціна выдаў яму 3 цэнтнэры саломы для подсьцілу заявіў: «вон брадзяга, я цябе не прызнаю за калгасьніка», пачаў яго лаяць з апошніх слоў, загадаў скінуць яго з возу з саломаю, а другі агент кулацтва ў калгасе Лукашэвіч пачаў біць дачку Хаюціна.

Калі-ж Хаюцін ня вытрываўшы зьдзекаў над сабой, заявіў пра гэта старшыні сельсавету Клімовічу, дык апошні ніякіх мер супроць гэтых антысэмітаў ня ўжыў, а адаслаў калгасьніка Хаюціна да сакратара партячэйкі Розіна, заявіўшы: «ідзі да т. Розіна, бо Жылінскі мяне ўсёроўна не паслухае». Апрача Хаюціна Жылінскі нацкоўваў членаў калгасу і на іншых калгасьнікаў-яўрэяў, гаворачы: «мы прыйшлі сюды іх так, каб яны разьбеглісь з калгасу».

У калгасе адсутнічаў вучот інвэнтара і прадуктаў. Пад сьнегам, на поле засталося шмат нявыбранае бульбы. Калі-ж калгасьнік Цыкевіч заявіў, што трэба гэтую бульбу сабраць з поля і раздаць калгасьнікам, то Жылінскі махнуў рукою і заявіў: «няхай лепш гніе. Валяецца пад сьнегам і жняярка. У Смалянскім пажарным будынку ад безгаспадарчага ўтрыманьня загінула 85 цэнтн. калгаснае вікі і канюшыны, якая расьцягвалася кім па пала і замест корму ішла на подсьціл жывёлы.

Усе члены праўленьня калгасу, маючы па 2 каровы, пасьля сталіну павінны былі па адной карове абагуліць, але замест абагуленьня, яны свае каровы распрадалі.

Ня гледзячы на тое, што ў Смалянах ёсьць досыць моцны культурны асяродак, як с.-г. тэхнікум, культурна-асьветная і інтэрнацыянальна-выхаваўчая масавая работа сярод калгасьнікаў «Камунару» не вялася. Крытыка і самакрытыка была ў поўным загоне. Старшыня сельсавету Клімовіч знаходзіцца на паваду ў кулацтва, з якім ён падтрымлівае сувязь і п'янствуе разам з імі ў доме свайго брата хутараніна.

Рэвізыйная камісія калгасу «Камунар», выявіўшы ўсе тэтыя злачынствы, накіравала акты сваё рэвізыі Кохановаўскаму райкалгассаюзу і Смалянскаму сельсавету, але апошнія да гэтага часу ня прыцягваюць шкоднікаў калгаснага будаўніцтва да адказнасьці.

М. Б.

Жанчынамі—членамі сельсавету—ня кіруюць

У часе перавыбараў у склад сяброў В. Машчаніцкага сельсавету, Бялыніцкага раёну, было абрана 25 проц. жанчын. Але пасьля выбараў пра іх забылі. Пленумы сельсавету наведваецца толькі адна жанчына—сябр сельсавету Адгэтуль відаць, што жанчыны, сябры сельсавету, стаяць у баку ад сац. будаўніцтва і ад той работы, якую на іх усклалі выбаршчыкі.

Сельсавет імі ня толькі ня кіруе, а нават не паведамляе аб часе скліканьня пленуму. Сельсавет не дасцэньвае гэтай важнейшай справы, лічучы непатрэбным ёю займацца. Парт'ячэйка таксама не адчуваецца у гэтым. Дэлегацкія сходы не праводзяцца.

Сельсавету і парт'ячэйцы неабходна пераключыць сваю работу на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб рабоце сярод жанчын.

Я. Канькоў.

Непадрыхтаваліся

Полацкая будаўнічая кантора не падрыхтавала будматар'ялы. Тэхнічных кіраўнікоў зусім, мала, а тыя, што маюцца дрэнна выконваюць свае абавязкі. Да апошніх належаць галоўны інжынэр Сьлівак і загадчык будканторы Гарнастаяў, які нават не зьявіўся на бюро партячэйкі, калі яго выклікалі.

Рабкор Свой.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

16-га мая а 6-й гадз. ўвечары ў Культпроце ЦК КП(б)Б скліканецца нарада ўсіх таварышоў-камуністых, працуючых у галіне дыалектычнага матэрыялізму і ленінізму (навуковыя працаўнікі і асьпіранты). На нараду павінны зьявіцца таксама камуністы-сябры праўленьняў усіх марксісцкіх навуковых таварыстваў.

Камарынскім РК КП(б)Б і РКК скліканецца раённы зьлёт рабселькораў і рэдкалегій насьценгазэт на 24 мая 1931 г., а 11 гадз. ранцы з абвесткай дню:

1. Вынікі ўсесаюзнага рабселькораўскага зьлёту.
2. Нізавы друк і яго роля ў сацыялістычнай перабудове вёскі.

На раённы зьлёт рабселькораў павінны зьявіцца селькоры, насьценкоры юнкоры, сябры рэдкалегій насьценгазэт: школьных, калгасных, камсамольскіх і г. д., хатнікі, чырвонакутнікі і сакратары парт. і камсамольскіх ячэек.

Пасьля зьлёту застаюцца старшыні рэдкалегій для прапрацоўкі пытаньняў тэхнікі і спосабаў выпуску насьценгазэт.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Яўрэйскі Дзяржтэатр Украіны — (- Сёньня -) адчыненьне НІТ ГЭДАЙГЭТ. Дзеці да 14 год не дапушчаюцца. Пач. а 8 г. Білеты прад. у раб. касе з 12—2 г. і з 4—6 г.

Дзяржцырк — Сёньня і штодзённа ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ. Пачат. а 8 з пал. гадз. увечары. 16 і 17 мая г. г. дняўны паказ з удзелам наезднікаў, жакеяў, акрабатаў, дрэсіроўшчыкаў животных. Льготныя білеты для мясцкомаў у рабкасе

„Чырвоная Зорка" — Новы фільм сэзону, ЭКСПОНАТ З ПАНОКТЫКУМУ. Звыш праграмы Кіно-хроніка Саюзкіно № 20. Пач. а 7, 8 45, 10 30 г. Каса адч. з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура" — Новы фільм Джым Шванта. Звыш праграмы камэдыя РОМЭО і ДЖУЛЬЕТА. Пачат. а 7, 8 45 г., 10 30 г. Каса адч. з 5 г.

Кіно „Інтэрнацыянал" — Сарачынскі кірмаш. Камэд. у 6 част. па апов. Гогаля. Пачат а 6 г. Каса адч. з 4 гадз. 30 хвіл.

Кіно „Пралетары" — Нямецкі фільм Прабуджэньне жанчыны. Драма ў 6 част. Пачатак а 7 гадз.

Кіно „Юны Піянэр" — эпізод грамадзянскай вайны Бухта сьмерці драма ў 7 частк. Пачат. сэансу а 1 г. дня. Каса адч. з 11 г.

Цэнтральная кіно-рамонтная майстэрня Белдзяржкіно (Менск, Рэвалюцыйная 4).

ПРЫМАЕ Ў РАМОНТ

кіно-праекцыйную апаратуру ўсіх сыстэм як стацыянарных, так і перасовак.

Атрыманы ўсе кіно-часткі да апаратаў „ПАТЭ", „ТОМП" і „ГОЗ" усіх выпускаў.

БЕЛДЗЯРЖКІНО

КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН

перавыбарчых сходаў па выбарам дэпутатаў у Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў па тым выбарчым вучасткам, дзе перавыбарчыя сходы не адбыліся

№№ п-п.	Назва ўстаноў і прадпрыемстваў	Час сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны выбарчай камісіі
	На 28 мая			
1	Утрыманцы рабочых і служачых заводу імя Варашылава	7	Клюб мэталістаў	Беркоўскі
2	Утрыманцы членаў саюзу мэдсанпрацы	7	„ гарсавету	Нісенбаум
3	Утрыманцы членаў саюзу камунальнікаў	7	„ камунальнікаў	Шнхасік
4	Утрыманцы членаў саюзу: земляробчага, жывёлагадоўчага, мачына-трактар. і батрацтва	7	Дом калгасьніка	Якубовіч
5	Утрыманцы каапэрыраваных саматужнікаў, аб'яднаемых прамысловакаапэрацыйнымі арцелямі	7	Клюб саматужнікаў	Эльперын
	На 30 мая			
6	Утрыманцы рабочых і служачых скарняжнай ф-кі, швэйнай лябараторыі, фабзавуча, швэйаб'яднаньня, гаргрупкому швэйнікаў, ф-ка імя 8 сакавіка, -кі імя Крупскай і членаў саю у тэ стыльшчыкаў	7	Чырвоны куток ф-кі „Кастрычнік", (Ленінская, 14).	Беркоўскі
7	Утрыманцы членаў саюзу хэмікаў	7	Клюб камунальнік.	Млодак
8	Утрыманцы рабочых і служачых заводу Полымя Рэвалюцыі і Белмэтальаб'яднаньня	7	„ Ільліча	Арлоў
9	Неарганізаванае насельніцтва, пражываючае ў 1 і 3 аддз. міліцыі і ўтрыманцы інвалідаў страхкасы	7	„ Гарсавету	Дзічкоўскі
10	Утрыманцы рабочых і служачых ф-кі „Беларуска" і астатніх членаў саюзу дрэваапрацоўшчыкаў апрача ўтрыманцаў заводу дрэваапрацоўшчык	7	„ Эльводу	Шалкавец

Менская гарадзкая выбарчая камісія.

Завочныя курсы марксызму-ленінізму пры курсах Марксызму-Ленінізму ЦВК СССР

Завочныя курсы марксызму-ленінізму ставяць сваёй задачай падвышэньне тэарэтычнага ўзроўню членаў партыі, якія вядуць адказную работу ў цэнтральных, абласных і краёвых партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафэсыянальных, гаспадарчых і каапэрацыйных установах і кіруючую работу ў такіх-жа ўстановах раённага маштабу.

Завочныя курсы марксызму-ленінізму вядуць работу на аснове вучэбных плянаў і праграм асноўных курсаў марксызму-ленінізму.

Вучэбны плян ЗКМЛ разьлічан на 3 гады: гісторыя УсеКП(б)—10 заданьняў—(18 дэкад); палітэканомія—15 заданьняў—(30 дэкад); эканомпалітыка—9 заданьняў—(18 дэкад); ленінізм—8 заданьняў—(12 дэкад); дыямат—12 заданьняў—(30 дэкад).

Усе пералічаныя дысцыпліны прапрацоўваюцца па першапачатковых крыніцах (К. Маркс, Ф. Энгельс, Ленін).

Завочныя курсы марксызму-ленізму пачынаюць прапрацоўку вучэбнага пляну з установачай канфэрэнцыі (2 дэкады); прапрацаваўшы дысцыпліну выклікаюцца на падагульняючую канфэрэнцыю.

Завочнікі ЗКМЛ карыстаюцца, акроч выхадных дзён, трыма вольнымі днямі ў месяц (пастанова ЦК УсеКП(б) ад 9-IX—1929 г. і 16-X—1930 г.).

Прыём на завочныя курсы марксызму-ленінізму ў працягу ўсяго году бесперапынны. Залічэньне праводзіцца мандатнай камісіяй ЦК УсеКП(б) па камандыроўках ЦК УсеКП(б), ЦКК, ПУР-а, УсеЦСПС, Абкому і Крайкомаў.

Завочныя курсы марксызму-ленінізму выпускаюць часопіс «Завочныя курсы марксызму-ленінізму», у якім зьмяшчаюцца кіруючыя арт